ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА



## Пісаць, каб не было сорамна



## Нашы святыні стануць вядомыя ў свеце

СТАР. 5



## Усёпераможнае каханне на «Белай вежы»

СТАР. 8

Родная газета на роднай мове
ЗВЯЗДА
Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
22 ВЕРАСНЯ 2015 г. АЎТОРАК № 181 (28039) Кошт 2000 рублёў
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

# Зіма будзе цёплай



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Максім СТАНКЕВІЧ працуе ў Івянцы вадзіцелем. Але з надыходам восені яму вельмі дарэчы навыкі дрывасека.
— Мая сям'я жыве ў адным доме з бацькамі, і мой абавязак — падрыхтаваць паліва для абагрэву нашага агульнага жытла ў халодны час, — тлумачыць сваю руплівасць гэты жыццярадасны 27-гадовы івянчук.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Сяргей ЛЕБЕДЗЕЎ, кіраўнік місіі назіральнікаў ад СНД на выбарах Прэзідэнта Беларусі:**

*«Місія назіральнікаў ад СНД падрыхтавала першую прамежкавую справаздачу аб выбарчай кампаніі ў Беларусі. Яна ў хуткім часе будзе апублікавана. Там даецца ацэнка выбарчага заканадаўства Беларусі, якое за апошнія гады зведала пазітыўныя змены ў бок большай дэмакратызацыі выбараў і большага ўліку інтарэсаў грамадзян. Выбарчая кампанія ў Беларусі праходзіць у строгай адпаведнасці з заканадаўствам. Мы атрымалі інфармацыю, што на адрас ЦВК паступілі 133 скаргі, ёсць скаргі на адрас МУС і пракуратуры. Яны ўважліва разглядаюцца, на іх даюцца адказы, прымаюцца меры. Місія назіральнікаў сочыць за гэтым. Бо галоўная мэта — забяспечыць права грамадзян Беларусі на свабоднае волевыяўленне».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 22.09.2015 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 17530,00 | ▼ |
| Еўра | 19809,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 264,97 | ▼ |
| Укр. грыўня | 802,66 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X
15181>

# ІХ ПАЛЁТЫ НЕ ТОЛЬКІ Ў СНЕ

### Мінскі спартыўна-аздараўленчы цэнтр «Фрыстайл» упершыню пасля свайго адкрыцця прыняў міжнародны турнір лыжных акрабатаў

**На адкрытым чэмпіянаце краіны па скачках на лыжах у ваду выступілі 38 спартсменаў з Беларусі, Расіі, Украіны, Казахстана і Швейцарыі.**

У нядзелю на новую арэну прыходзілі сем'ямі, невялікая колькасць месцаў (трыбуны разлічаны на 500 гледачоў) дабаўляла атмасферы цяпла і камфорту. Без перабольшання тут сабралася эліта лыжных акрабатаў, сярод іх Ала Цупер з паўгадавалым сынам, дачкой і мужам, Дзмітрый Дашчынскі з жонкай і дзіцем, Аляксей Грышын і, вядома, мэтр айчыннага фрыстайлу — Мікалай Казека. Настаўнік паспяваў размаўляць са сваімі былымі вучнямі, сачыць за выступленнямі дзеючых спартсменаў і раздаваць інтэрв'ю.

Нешта падказвала, што спаборніцкі дзень павінен скласціся ўдала для нашай краіны.

СТАР. 3




Фота Надзеі БУЖАН.

**Аляксей ГРЫШЫН і Дзмітрый ДАШЧЫНСКІ завяршылі сваё выступленне за нацыянальную зборную.**

## ■ Надвор'е

# НЕ ПА СЕЗОНЕ...

### З чацвярга ў Беларусь ізноў завітае анамальнае цяпло, калі сярэдняя тэмпература паветра чакаецца на 3-6 градусаў вышэй за норму

**І на гэтым тыдні верасень парадуе беларусаў цёплым і камфортным надвор'ем. Аб гэтым паведаміў начальнік службы гідраметэаралагічных прагнозаў Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды Дзмітрый РАБАЎ.**

У першай палове тыдня надвор'е будуць вызначаць вобласць высокага атмасфернага ціску і цёплыя паветраныя масы з паўднёвага захаду Еўропы. Сёння пераважна без ападкаў, а максімальная тэмпература паветра складзе 14-20 цяпла. Не чакаецца ападкаў і ў сераду. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 3-10 градусаў, па паўднёвым захадзе месцамі да плюс 12. Удзень будзе 18-25 цяпла.

Сапраўды камфортна ў нас стане ў другой палове тыдня, калі ў краіну пачне паступаць больш цёплая, але вільготная паветраная маса з Чорнага мора. Таму ў некаторых раёнах пройдуць кароткачасовыя дажджы, магчымы навальніцы. Уначы і раніцай месцамі слабы туман. Тэмпература паветра ўначы на чацвер складзе 9-15 цяпла, удзень будзе ўжо плюс 21-26 градусаў, а па паўднёвым усходзе паветра прагрэецца да 28 з плюсам. У пятніцу ўначы чакаецца 9-16 цяпла, удзень — плюс 21-26, па паўднёвым усходзе — нават да 28 градусаў цяпла.

Паводле доўгатэрміновых прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у выхадныя прагназуецца няўстойлівы характар надвор'я. У суботу захаваецца яшчэ цёплае і спакойнае надвор'е, бо толькі месцамі пройдуць кароткачасовыя дажджы. Тэмпература паветра ўначы на суботу складзе 10-17 цяпла, удзень — плюс 18-25 градусаў, а па паўднёвым усходзе паветра прагрэецца да 27 цяпла. Аднак у нядзелю надвор'е пачне пагаршацца. Тады актыўны атмасферны фронт прынясе ўначы месцамі, а ўдзень амаль паўсюдна кароткачасовыя дажджы. Тэмпература паветра ўначы складзе 9-15 цяпла, удзень — плюс 13-20, а па паўднёвым усходзе да плюс 21-25 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

# ТЭРЫТОРЫЯ МАШТАБНЫХ ПРАЕКТАЎ

## ПРАМЫЯ КАНТАКТЫ З РАСІЙСКІМІ СУБ'ЕКТАМІ ГАСПАДАРАННЯ З'ЯЎЛЯЮЦЦА АСНОВАЙ ГАНДЛЁВА-ЭКАНАМІЧНАГА ЎЗАЕМАДЗЕЯННЯ І ФУНДАМЕНТАМ АДНОСІН НАШЫХ КРАІН

**Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы з губернатарам Ульянаўскай вобласці Сяргеем Марозавым. Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што гэтая сустрэча стала працягам нядаўняй размовы, якая была пачата на самым высокім узроўні ў Сочы. «Там адбылася не проста размова, а было прадэманстравана наша адзінства і жаданне развіваць супрацоўніцтва», — падкрэсліў Прэзідэнт Беларусі.**

Аляксандр Лукашэнка адзначыў важнасць таго, што Ульянаўская вобласць з'яўляецца прызнаным лідарам Расіі ў аўтамабіле- і авіябудаванні. Пры гэтым рэгіён імкнецца быць адным з перадавых у пашырэнні прыватнага бізнесу і прыцягненні буйных інвестараў. Беларускія прадпрыемствы звязаны з вытворчасцямі Ульянаўскай вобласці адзіным тэхналагічным ланцужком. Яны пастаўляюць у гэты расійскі рэгіён аўтакампаненты, помпы, рухавікі і сілавыя ўстаноўкі. Прэзідэнт лічыць, што трэба не проста працягнуць гэтую работу, а задзейнічаць увесь існуючы патэнцыял і пашыраць сферы двухбаковага супрацоўніцтва, рэалізуючы маштабныя праекты.

Кіраўнік дзяржавы перакананы, што прыярытэтнымі напрамкамі супрацоўніцтва Беларусі і Ульянаўскай вобласці могуць стаць вытворчая кааперацыя, аграпрамысловы і будаўнічы комплексы. Ва Ульянаўскай вобласці добра ведаюць беларускую тэхніку, якая задзейнічана ў сельскай гаспадарцы, дарожным будаўніцтве, камунальнай галіне. На яго думку, перспектыўныя і сумесныя праекты ў сферы пасажырскага транспарту. «Тым больш што ў цяперашніх няпростых эканамічных умовах ёсць магчымасць набываць адпаведную тэхніку ў Беларусі», — заўважыў Прэзідэнт.

Беларусь гатова садзейнічаць Ульянаўскай вобласці ў развіцці сельскай гаспадаркі, асабліва ў мадэрнізацыі жывёлагадоўчай галіны. Пры маштабным развіцці жылля ў рэгіёне запатрабаваны будаўнічыя матэрыялы і ліфтавае абсталяванне. «Калі ёсць жаданне і магчымасць, мы гатовыя ўдзельнічаць і ў гэтай справе», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, беларускія суб'екты гаспадарання маюць рэальную магчымасць прыняць самы актыўны ўдзел у стварэнні транспартнай інфраструктуры на тэрыторыі Ульянаўскай вобласці, у прыватнасці дапамагчы ў будаўніцтве аўтадарог і лагістычных цэнтраў.

Акрамя таго, Прэзідэнт лічыць, што разам з развіццём гандлёва-эканамічнага партнёрства не варта забываць аб гуманітарных аспектах узаемадзеяння. Неабходна пашыраць кантакты ў сферах адукацыі, навукі і высокіх тэхналогій, аховы здароўя, спорту і турызму.

Сяргей Марозаў, у сваю чаргу, падзякаваў Прэзідэнту Беларусі за магчымасць цяперашняй сустрэчы, а таксама за сустрэчу, якая адбылася ў верасні 10 гадоў таму, калі ён толькі пачынаў працаваць на пасадзе губернатара. Кіраўнік расійскага рэгіёна адзначыў, што для яго была вельмі карыснай тая сустрэча дзесяцігадовай даўнасці. «Вы расказвалі мне, што вы робіце, чаму і што маглі б параіць зрабіць мне, расійскаму губернатару. Таму што на той момант некалі багатая і досыць паспяховая Ульянаўская вобласць знаходзілася далёка не ў найлепшым стане, — сказаў Сяргей Марозаў. — За 10 гадоў мы прайшлі даўжэзны шлях і многае з таго, што вы мне тады казалі, нам удалося рэалізаваць».

Цяпер Ульянаўская вобласць з'яўляецца адным з інвестыцыйна прывабных рэгіёнаў Расіі. На словах Сяргея Марозава, рэгіён гатовы прапанаваць самыя выгадныя ўмовы для сумесных з Беларуссю праектаў у жывёлагадоўлі і раслінаводстве. На перамовах абмяркоўвалася магчымасць стварэння ва Ульянаўскай вобласці з удзелам Беларусі буйнога сельгаспрадпрыемства, дзе можна было б укараняць найлепшы беларускі вопыт і напрацоўкі ў АПК. Аб выкарыстанні беларускага вопыту гаворка ішла і ў сувязі з маючым адбыцца ў наступным годзе ва Ульянаўску чэмпіянатам свету па хакеі з мячом, на які ўжо заяўлены ўдзел Беларусі.

Аляксандр Лукашэнка і Сяргей Марозаў таксама абмеркавалі перспектывы развіцця культурных сувязяў, у прыватнасці разглядаецца магчымасць абмену Днямі культуры, паведамляе прэс-служба беларускага лідара.

Сяргей Марозаў выказаў словы захаплення тым, як змянілася беларуская сталіца. «10 гадоў тут не быў. Праехаў па горадзе — цудоўна тое, што вы будуеце, ствараеце», — адзначыў кіраўнік расійскага рэгіёна. Ён запэўніў, што будзе імкнуцца зрабіць Ульянаўск такім жа прыгожым, як Мінск.

Падводзячы вынікі сустрэчы, Аляксандр Лукашэнка выказаў упэўненасць, што пры ўмове паспяховай рэалізацыі намечаных маштабных праектаў узаемадзеянне Беларусі з Ульянаўскай вобласцю можа стаць прыкладам таго, як можна і трэба супрацоўнічаць, і не толькі з рэгіёнамі, але і іншымі краінамі.

■ Добрая навіна

# НОВЫ МОСТ ПРАЗ БЯРЭЗІНУ

**Размова ідзе пра Шчаткаўскі мост на бабруйскай аб'язной дарозе, будаўніцтва якога пачалося ў мінулым верасні і якое планавалася расцягнуць на 33 месяцы. Але аб'ект здадзены датэрмінова – мостабудаўнікам хапіла ўсяго года.**

— Паскорыць тэмпы дапамагло тое, што былі прыцягнуты дадатковыя сілы будаўнікоў і праца вялася вахтавым метадам – без выхадных, — адзначыў **галоўны інжынер прадпрыемства «Магілёўаўтадар» Барыс ІВАНОЎ.** — Упершыню ў рэспубліцы выкарыстоўваліся канструкцыі айчыннай вытворчасці — магілёўскага прадпрыемства «Протас». Амаль паўкіламетровы мост — гэта першы этап рэканструкцыі аўтамагістралі М5 (Мінск—Гомель) на ўчастку Бабруйск—Жлобін. Астатнія 78 кіламетраў трасы мы таксама плануем здаць датэрмінова. Згодна з указам Прэзідэнта, дата ўводу аб'екта ў эксплуатацыю 1 верасня наступнага года, мы збіраемся зрабіць падарунак да Дня Незалежнасці.

Зараз вядуцца работы на старым мосце, які знаходзіцца побач з новым. Пасля яго рэканструкцыі аўтамагістраль стане ўдвая шырэйшай, на ёй будзе арганізаваны чатырохпалосны рух. Дарэчы, будаўніцтва гэтага ўчастка дарогі вядзецца за кошт крэдытных сродкаў Кітайскага банка. Заказчыкам аб'екта выступае прадпрыемства «Магілёўаўтадар».

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

# Галоўнае — станоўчы вынік

Той, хто пакутуе ад алкагольнай ці наркатычнай залежнасці, павінен мець магчымасць выбіраць лячэнне

**Такое меркаванне выказала намеснік прэм'ер-міністра Наталля КАЧАНАВА на выязным пасяджэнні Міжведамаснага савета па папярэджанні і прафілактыцы п'янства, алкагалізму, наркаманіі і спажывання тытуню пры Савеце Міністраў, паведамляе БЕЛТА.**

«Наша задача — стварыць у краіне такія ўмовы, якія дазволілі б чалавеку, што трапіў у цяжкую алкагольную або наркатычную залежнасць, мець права выбіраць, якім шляхам яму лячыцца. Бо, акрамя лячэбна-працоўных прафілакторыяў (ЛТП), куды накіроўваюць па рашэнні суда, дапамога можа быць прадастаўлена наркалагічнымі дыспансерамі і рэабілітацыйнымі цэнтрамі», — сказала Наталля Качанава.

Яна падкрэсліла, што ў лячэбна-працоўных прафілакторыях знаходзіцца шмат людзей працаздольнага ўзросту. У большасці сваёй гэта мужчыны ад 31 да 40 гадоў. Віцэ-прэм'ер выказала думку, што калі б тлумачальная работа пра спосабы лячэння алкагольнай і наркатычнай залежнасці вялася шырэй, то колькасць накіраваных у ЛПП грамадзян значна скарацілася б.

«Трэба, каб людзі ведалі пра тое, што можна зрабіць выбар. Хочаш лячыцца добраахвотна — калі ласка, для гэтага ёсць адпаведныя медыцынскія ўстановы ў раённых і абласных цэнтрах. Калі жадання лячыцца няма, то прыйдзецца адпраўляцца ў ЛПП», — адзначыла віцэ-прэм'ер.

«Прэзідэнт паставіў задачу арганізаваць такія лячэбныя ўстановы, дзейнасць якіх забяспечвала б атрыманне эфектыўнага выніку для тых, хто трапіў у цяжкую форму алкагольнай і наркатычнай залежнасці. На мой погляд, добрыя ўсе метады, калі яны прыносяць карысць, і чалавек вяртаецца ў соцыум», — дадала намеснік прэм'ер-міністра.

■ Выбары-2015

# ЧАС РАСКАЗАЦЬ ПРА СЯБЕ

Як нагадала падчас відэазвароту на сайце vybory2015.by **Лідзія ЯРМОШЫНА, старшыня Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў,** мясцовыя выканаўчыя органы павінны быць праінфармаваны аб правядзенні такога мерапрыемства не пазней за два дні да самой сустрэчы.

— Найбольш за ўсё заявак на правядзенне сустрэч падала ініцыятыўная група, якая падтрымлівае кандыдата ў Прэзідэнты Таццяну Караткевіч, — паведаміла старшыня Цэнтрвыбаркама. — Больш за 40 такіх заявак для сустрэч з выбаршчыкамі ня на адкрытым паветры, так і ў закрытых памяшканнях пададзена гэтым кандыдатам і яе даверанымі асобамі.

Па інфармацыі, агучанай Лідзіяй Ярмошынай, 16 заявак на правядзенне сустрэч — у асноўным у працоўных калектывах — пададзена ад даверных асоб кандыдата ў Прэзідэнты Аляксандра Лукашэнкі. Кандыдаты ў Прэзідэнты Мікалай Улаховіч і Сяргей Гайдукевіч падалі ў выбарчыя камісіі і мясцовыя выканаўчыя органы па 4 падобныя заяўкі.

Старшыня Цэнтральнай камісіі нагадала, што мясцовыя выканаўчыя органы прынялі рашэнне аб адвядзенні месцаў для сустрэч з выбаршчыкамі.

— Па сутнасці, у Мінску такія месцы вызначаны ўсюды, акрамя месцаў, спецыяльна забароненых мясцовымі выканаўчымі органамі, — заўважыла старшыня ЦВК. — У іх будуць усталёўвацца пікеты і праводзіцца сустрэчы кандыдатаў і іх даверaных асоб з выбаршчыкамі. Кандыдаты ў Прэзідэнты і іх даверныя асобы не пазней за два дні да правядзення падобнай сустрэчы павінны праінфармаваць у заяўляльным парадку мясцовыя выканаўчыя органы аб правядзенні такой сустрэчы і аб часе яе правядзення. Што да сустрэч у закрытых памяшканнях, то яны праводзяцца ў культурных і адукацыйных установах, тых памяшканнях, якія вызначылі мясцовыя выканаўчыя органы па ўзгадненні з тэрытарыяльнымі камісіямі. Кандыдаты ў Прэзідэнты і даверныя асобы падаюць адпаведныя заявы ў тэрытарыяльныя выбарчыя камісіі, і тыя прымаюць меры па забеспячэнні дадзеных сустрэч: размяшчаюць аб'явы па правядзенні сустрэч, забяспечваюць залы неабходнай электроннай апаратурай.

Лідзія Ярмошына параіла выбаршчыкам сачыць за інфармацыйнымі сайтамі мясцовых выканаўчых органаў: найперш там будуць публікавацца аб'явы аб сустрэчах кандыдатаў у Прэзідэнты з выбаршчыкамі. Акрамя гэтага, дадзеная інфармацыя таксама будзе размяшчацца ў мясцовых газетах, якія заснаваны дзяржаўнымі органамі.



Назіральнікі працуюць у рэгіёнах.

Фота БЕЛТА.

# НАЗІРАЛЬНІКІ ПАДРЫХТАВАЛІ ПЕРШУЮ СПРАВАЗДАЧУ

Місія назіральнікаў ад Садружнасці Незалежных Дзяржаў на выбарах Прэзідэнта Беларусі падрыхтавала першую прамежкавую справаздачу аб выбарчай кампаніі ў нашай краіне. Пра гэта заявіў учора пасля азнаямлення з работай Лагойскай раённай камісіі па выбарах кіраўніка дзяржавы **кіраўнік місіі Сяргей ЛЕБЕДЗЕЎ.** Па яго словах, справаздача павінна быць апублікавана ў самым хуткім часе. У ёй, па інфармацыі Сяргея Лебедзева, даецца ацэнка выбарчага заканадаўства нашай краіны, якое за апошнія гады зведала пазітыўныя змены ў бок большай дэмакратызацыі выбараў і большага ўліку інтарэсаў грамадзян. Увогуле кіраўнік місіі назіральнікаў ад СНД высока ацэньвае правядзенне выбарчай кампаніі ў нашай дзяржаве.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*


Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| Организатор аукциона | **ЗАО «Центр промышленной оценки»,** г. Минск, ул. Мележа 5/2, офис 1703 | | | |
| Продавец | **ОАО «МИЛКАВИТА»,** г. Гомель, ул. Бр. Лизюковых, 1 | | | |
| **Предмет аукциона, объекты недвижимого имущества, расположенные по адресу: Гомельская обл., г. Лоев, ул. Царикова, д. 39 (имущество реализуется одним лотом)** | | | | |
| № п.п. | Наименование | Назначение | Общая площадь | Инвентарный номер |
| 1. | **Бытовые помещения** | Здание административно-хозяйственное | 58,5 кв.м | 340/С-293597 |
| 2 | **Склад** | Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ | 115,9 кв.м | 340/С-293569 |
| 3 | **Здание конторы** | Здание административно-хозяйственное | 52,2 кв.м | 340/С-293567 |
| 4 | **Здание производственного корпуса** | Здание специализированное для производства продуктов питания, включая напитки, и табака | 267,5 кв.м | 340/С-293570 |
| *Составные части и принадлежности | Забор с воротами, асфальтное покрытие 1054,6 кв.м | | | |
| 5 | **Котельная** | Здание специализированное коммунального хозяйства | 100,2 кв.м | 340/С-293568 |
| *Составные части и принадлежности | Труба дымовая (h=24м), емкости для топлива 2 шт. по 6 куб.м. | | | |
| 6 | **Гараж** | Здание специализированное автомобильного транспорта | 82,3 кв.м | 340/С-293565 |
| 7 | **Кабельная линия электропередач** | Две кабельные линии 0,4кВ, длина 30 м | | |
| **Начальная цена с НДС 20% – 2 079 533 400 белорусских рублей.** | | | | |
| **Сведения о земельном участке** | Для обслуживания зданий и сооружений молочного завода продавцу предоставлен на праве постоянного пользования земельный участок пл. **0,3603 га.** Ограничения (обременения) – находится в водоохранных зонах | | | |
| **Задаток 10% от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с №3012343260010; нерезидентами РБ в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012343265044; в евро (EUR) – 3012343265060; в российских рублях (RUB) – 3012343265028; в Дирекции «ОАО Белинвестбанк» по г.Минску и Минской области, БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»** | | | | |
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **15** рабочих дней после проведения аукциона | | | |
| **Условия оплаты предмета аукциона** | | | | |
| Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после подписания договора купли-продажи. | | | | |
| Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by** | | | | |
| **Дата и время проведения аукциона** | **26.10.15 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** | | | |
| **Дата и время окончания приема документов** | **23.10.2015 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»** | | | |
| **Контактные телефоны** | **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 29-183-69-71. E-mail: auction@cpo.by** | | | |


**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь глыбока смуткуюць у сувязі са смерцю старшыні Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў АЦЯСАВА Аляксандра Ягоравіча і выказваюць глыбокае спачуванне яго родным і блізкім.**

**Калектыў РВУ «Выдавецкі дом «Звязда» выказвае глыбокія спачуванні родным і блізкім АЦЯСАВА Аляксандра Ягоравіча, старшыні Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў, у сувязі з яго смерцю.**

# НЕБА БЕЗ «ДЗІРАК»



## Беларусь уваходзіць у першую дваццатку краін, якія адказна ставяцца да зберажэння азонавага слою

**Словазлучэнне «азонавая дзірка» вядомае любому адукаванаму чалавеку. І ад таго, што праблема даўно акрэслена, стаўленне да яе ў насельніцтва ўжо звыкла-спакойнае. Хоць навукоўцы не стамляюцца нагадваць, што ўздзеянне ўзмацнелай ультрафіялетавай радыяцыі здольна выклікаць рак скуры, катаракту вачэй, прыгнятае імунную сістэму чалавека, а таксама наносіць непрадказальную шкоду раслінам, водарасцям і глабальнай экасістэме, у тым ліку глабальнаму клімату.**

Між тым беларускія анколагі сведчаць, што ў апошні час у нашых суайчыннікаў на першае месца сярод анкалагічных захворванняў выйшлі злаякасныя пухліны скуры. Адзін з асноўных фактараў рызыкі для гэтых пухлін — якраз-такі ўльтрафіялетавае выпраменьванне. Але чаму ў беларусаў, якія жывуць далёка не на экватары і не каля Антарктыды, дзе размешчана велізарная азонавая дзірка, лідзіруюць менавіта злаякасныя пухліны скуры, сказаць ніхто не бярэцца. Тым не менш анколагі адзначаюць, што цяпер многія нашы суайчыннікі выязджаюць на адпачынак у паўднёвыя краіны, дзе, загараючы, нярэдка атрымліваюць апёкі.

Але ні адзін сонечны апёк не праходзіць бясследна, сцвярджае **загадчык прыёмнага аддзялення, хірург РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі к.м.н. Генадзь РЫМДЗЕНАК.** Нават калі і здаецца, што ўсё абышлося, гэта можа быць не так. Яны могуць даца ў знакі і праз 20, і праз 30 гадоў — тэрміну даўнасці тут не існуе. Да ведама: банальнае пачырваненне скуры пасля пляжу медыкі разглядаюць ужо як апёк 1-й ступені. Таму, адзначае Генадзь Рымдзенак, загараць трэба вельмі асцярожна, асабліва сінявокім і светласкурым людзям.

Але ёсць і добрыя навіны. Навукоўцы абяцаюць, што ў наступныя некалькі дзесяцігоддзяў азонавы слой на планеце адновіцца да кантрольных узроўняў 1980 года. Гэтага дазволіць дасягнуць узгодненыя міжнародныя дзеянні па барацьбе з азонаразбуральнымі рэчывамі.

Наша краіна адной з першых падпісала Венскую канвенцыю (ратыфікаваную ў 1986 годзе) аб ахове азонавага слоя і Манрэальскі пратакол (ратыфікаваны ў 1988 годзе) па рэчывах, што разбураюць азонавы слой, тым самым узяўшы на сябе строгія абавязацельствы па скарачэнні і спыненні спажывання азонаразбуральных рэчываў.

За апошнія пяць гадоў, па словах **вядучага навуковага супрацоўніка Нацыянальнага навукова-даследчага цэнтра маніторынгу азонасферы БДУ Аляксандра КРАСОЎСКАГА**, спажыванне азонаразбуральных рэчываў у Беларусі скарацілася на 50%. І, у адпаведнасці з абавязацельствамі, наша краіна павінна цалкам спыніць спажыванне азонаразбуральных рэчываў да 2020 года.

Разбураюць азонавы слой запуск касмічных ракет і самалётаў, якія лётаюць на вышыні ў 12-16 км. Але самай галоўнай прычынай яго разбурэння з'яўляецца хлор і яго вадародныя злучэнні, якія трапляюць у атмасферу ў першую чаргу ад раскладання фрэонаў. Пры гэтым, як паведаміў **начальнік упраўлення рэгулявання ўздзеяння на атмасфернае паветра і водныя рэсурсы Міністэрства прыроды і аховы навакольнага асяроддзя Сяргей ЗАЎЯЛАЎ**, малекула хлору знішчае 200 тысяч малекул азону. Таму хлор, бром і фтор, якія трапляюць у верхнія слаі атмасферы, здольны выклікаць сур'ёзныя наступствы.

У свеце ўжо знойдзены заменнік фрэонаў у аэразолях — прапан-бутанавая сумесь. Яна амаль не саступае фрэону па параметрах, адзіным мінусам з'яўляецца толькі тое, што яна вогненебяспечная. Такія аэразолі ўжо досыць шырока выкарыстоўваюцца. Што тычыцца халадзільных установак, справы ідуць крыху горш. Тым не менш Мінскі завод халадзільнікаў ЗАТ «Атлант», які да 1993 года выпускаў халадзільнае абсталяванне, што працавала на азонаразбуральных рэчывах, у прыватнасці на фрэоне, пачынаючы з 2002 года перайшоў на вытворчасць халадзільнікаў і маразільнікаў з ужываннем азонабяспечнага холадагента R600a.

Азонаразбуральныя рэчывы пакуль яшчэ выкарыстоўваюцца ў ТАА «Завод аўтамабільных прычэпаў і кузаваў «МАЗ-Купава» для ўспенявання панэляў і на Давыд-Гарадоцкім электрамеханічным заводзе — для абястлушчвання дэталяў. Але, як паведаміў Сяргей Заўялаў, і гэтыя прадпрыемствы павінны будуць пазбавіцца ад азонаразбуральных тэхналогій.

На «МАЗ-Купава» неўзабаве будзе заключаны кантракт на пастаўку новага італьянскага абсталявання, якое дасць магчымасць адысці ад азонаразбуральных тэхналогій. Такое ж бяспечнае абсталяванне ў верасні з'явіцца і ў Давыд-Гарадку. Кампанія «Мясамалмантаж» будзе вырабляць малагабарытныя аміячныя ўстаноўкі, якія пойдуць на змену абсталяванню, што змяшчае азонаразбуральныя рэчывы.

У цэлым у нашай краіне, па словах спецыялістаў, пачынаючы з 1996 года выведзена з абарачэння звыш 600 т розных азонаразбуральных рэчываў, а з 2007 года дзейнічае сістэма ліцэнзійнага рэгулявання абыходжання з азонаразбуральнымі рэчывамі.

**Святлана БУСЬКО.** *busko@zviazda.by*

# ІХ ПАЛЁТЫ НЕ ТОЛЬКІ Ў СНЕ

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

А тут яшчэ і Ганна Гуськова, якая ў суперфінал спаборніцтваў выйшла з найлепшым вынікам. Ну, а там, у апошняй спробе, яна выканала трайное сальта: першае — прагнуўшыся, другое з групоўкай, а трэцяе з вінтом. Суддзі ацанілі яе выступленне ў 85,40 бала, што дазволіла нашай суайчынніцы падняцца на першы радок п'едэстала. Другой стала расіянка Аляксандра Арлова, трэцяй — яе сяброўка па камандзе Таццяна Бабіч.

*— Усведамленне таго, што я перамагла, прыйшло толькі ў той момант, калі паднялася на п'едэстал. Вялікі дзякуй, што пабудавалі для нас такі цэнтр, вельмі прыемна і камфортна было выступаць тут,* — не хаваючы хвалявання падзялілася ўражаннямі ад спаборніцтваў Ганна Гуськова.



Фота Надзеі БУЖАН.

**Пераможца — беларуска Ганна ГУСЬКОВА** *(у цэнтры)*, **сярэбраны прызёр Ганна АРЛОВА і бронзавы прызёр Таццяна БАБІЧ.**

У мужчын першынстваваў заяўлены лідар швейцарац Міша Гесер, які набраў найбольшую суму балаў як у фінале, так і ў суперфінале (131,81). Расіянін Пётр Мядуліч і швейцарац Дзімітры Іслер сталі ўладальнікамі сярэбранага і бронзавага медалёў адпаведна.

Прадстаўнікі Беларусі Дзяніс Восіпаў і Максім Гусцік *(на фота)* замкнулі пяцёрку найлепшых, Дзяніс стаў чацвёртым, Максім фінішаваў пятым.

*— За Ганну рады, яна змагла выйграць у сур'ёзных саперніц. Што ж тычыцца мужчын, то ўсе тры атлеты, якія сталі прызёрамі, выканалі трайное сальта з пяццю піруэтамі. Нашы хлопцы пакуль такой праграмай не валодаюць, таму будзем працягваць працаваць,* — так падвёў вынікі выступлення сваіх падапечных **галоўны трэнер зборнай Беларусі Мікалай КАЗЕКА.**

Нагадаем, у спаборніцтвах не прыняў удзел лідар мужчынскай беларускай зборнай Антон Кушнір, ён назіраў за барацьбой з трыбун, таму што аднаўляецца пасля хваробы.

Адкрыты чэмпіянат Беларусі стаў этапам падрыхтоўкі нашых спартсменаў да зімовага сезона. Ужо ў канцы кастрычніка каманда адправіцца на «снежныя» зборы, а пазней пачнуцца этапы Кубкаў свету і Еўропы.

Акрамя спаборніцкай праграмы, турнір уключаў урачыстую цырымонію ўшанавання нашых славутых фрыстайлістаў Дзмітрыя Дашчынскага і Аляксея Грышына, якія афіцыйна завяршылі сваё выступленне за нацыянальную зборную. Дзмітрый, дарэчы, працягвае працаваць у камандзе: ён займаецца падрыхтоўкай маладых спартсменаў.

*— Узнагароджанне стала для нас сюрпрызам. Я ўжо забыўся, калі перастаў скакаць, а тут такая нечаканасць. Вельмі прыемна, што заўзятары і кіраўніцтва яшчэ памятаюць пра нас. Вялікі дзякуй за ўсё мерапрыемства і добрыя словы,* — адзначыў **Дзмітрый ДАШЧЫНСКІ.**

Нагадаем, спартыўна-аздараўленчы цэнтр «Фрыстайл» быў адкрыты ў красавіку 2015 года. Арэна з'яўляецца ўнікальнай, пры яе будаўніцтве выкарыстоўваўся вопыт швейцарскіх спецыялістаў. Высокатэхналагічнае абсталяванне стадыёна дазваляе ў падрыхтоўчы перыяд правесці эфектыўную працу, падвесці лыжных акрабатаў да асноўнай часткі сезона ў аптымальнай форме. Трамплін выкананы з палімернага пакрыцця і арашаецца вадой, што замяняе фрыстайлістам снежны схіл. Скачуць спартсмены ў самы глыбокі (7,5 м) у краіне басейн, ён абсталяваны паветранай падушкай, якая змякчае ўдар пры прызямленні атлета на ваду.



Пасля адкрыцця цэнтра паўсталі невялікія праблемы з разгоннай часткай трампліна, але ў самыя кароткія тэрміны ўсе непаладкі былі ліквідаваны, што дазволіла правесці першыя афіцыйныя спаборніцтвы на высокім узроўні. Гэта адзначылі як трэнеры, так і ўдзельнікі чэмпіянату.

**Галоўны трэнер зборнай Расіі Дзмітрый КАВУНОЎ:**

*— Наша каманда праводзіць ужо другі вучэбна-трэніровачны збор у новым комплексе. Расійскім спартсменам вельмі падабаецца тут скакаць, напрацоўваць праграму перад зімовым сезонам. Мінскі спарткомплекс «Фрыстайл» без перабольшання ўнікальнае збудаванне, аналагаў якому ў Расіі няма. Тое, пра што мы марылі вельмі доўга, з'явілася ў Беларусі. Цяпер пастаянна будзем прыязджаць сюды на зборы.*

**Галоўны трэнер нацыянальнай зборнай Швейцарыі, тэхнічны дэлегат Міжнароднай федэрацыі лыжнага спорту Майкл РОТ:**

*— Раней беларуская каманда прыязджала трэніравацца ў Швейцарыю, а цяпер, калі ў яе ёсць уласны цэнтр такога ўзроўню, спартсмены стануць яшчэ мацнейшымі! Хацелася б адзначыць, што спаборніцтвы прайшлі на высокім узроўні, не ўзнікла ніякіх праблем. Мне хацелася б павіншаваць усіх арганізатараў, яны папрацавалі на «выдатна».*

**Пераможца адкрытага чэмпіянату Беларусі Міша ГЕСЕР (Швейцарыя):**

*— Ваш цэнтр — гэта выдатнае месца, якое падыходзіць як для трэніровак, так і для міжнародных спаборніцтваў высокага ўзроўню. Спадзяюся, што гэты турнір стане традыцыйным і мы зноў убачымся ў наступным годзе.*

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.** *lobazhevich@zviazda.by*

■ Спорт-тайм

# УПУСЦІЛІ ШАНЦ

**1. Беларуская велагоншчыца Алена Амялюсік у складзе каманды «Velocio-SRAM» стала чэмпіёнкай свету** ў камандный гонцы на 38,8 км. Другое і трэцяе месцы занялі дзве каманды з Нідэрландаў — «Boels-Dolmans» і «Rabobank-Liv Woman».

**2. Хакейнае мінскае «Дынама» завяршыла сваю чатырохматчавую выязную серыю паражэннем ад «Сочы» 1-4.** Падапечныя Любаміра Покавіча пасля гасцявых перамог над «Спартаком» і «Ак Барсам» прайгралі спачатку ў Яраслаўлі, а потым і ў Сочы.

*— Мы ўбачылі сорак хвілін цікавай гульні. Матч мог завяршыцца на карысць любой з каманд. У другім перыядзе сочынцы змаглі аказаць моцны ціск, былі моманты і ў нас. Аднак сапернік выкарыстаў свае магчымасці, а мы не. У трэцім перыядзе гаспадары закінулі трэцюю і чацвёртую шайбы, чым і вырашылі зыход сустрэчы,* — адзначыў пасля гульні **галоўны трэнер «бела-сініх» Любамір ПОКАВІЧ.**

У Мінску 23 верасня «Дынама» сустрэнецца з «Югрой» з Ханты-Мансійска, 25 верасня — з екацярынбургскім «Аўтамабілістам».

**3. Брэсцкі гандбольны клуб імя Мяшкова на старце Лігі чэмпіёнаў атрымаў буйную перамогу** ў хатнім матчы над сербскай «Вайводзінай» 34-22.

*— Па складзе мы мацнейшыя і абавязаны былі перамагчы. Адыграла сваю ролю і даўжыня нашай лаўкі. Гэта дазволіла бегаць у контратакі і гуляць у другім тайме больш раскавана. Задаволены, што ўзялі першыя два ачкі ў Лізе чэмпіёнаў. Будзем працаваць над тым, каб падыходзіць да матчаў гэтага турніру з яшчэ больш вялікім жаданнем і злосцю. Таму што на выездзе гуляць будзе вельмі няпроста. А ў нашай групе для выхаду далей трэба займаць першае або другое месца,* — сказаў пасля гульні **галоўны трэнер БГК Сяргей БЯБЕШКА.**

**4. Зборная Беларусі пацярпела паражэнне ад каманды Партугаліі ў матчы 3-га раўнда II групы Еўра-Афрыканскай зоны Кубка Дэвіса.**

Вырашальнай стала гульня паміж першай ракеткай беларускай каманды Уладзімірам Ігнацікам і лідарам партугальцаў Жоао Соўзае, наш суайчыннік быў слабейшым — 1:6, 1:6, 4:6.

Такім чынам, па выніках папярэдніх сустрэч лік у матчы стаў 3:2 на карысць зборнай Партугаліі, якая прымала беларусаў на грунтавых кортах тэніснага клуба ў Віану-ду-Каштэлу.

Зборная Беларусі на наступны сезон па-ранейшаму застанецца ў II групе Еўра-Афрыканскай зоны Кубка Дэвіса (трэці па рангу дывізіён). Партугальцы ж атрымаюць пропуск у І групу Еўра-Афрыканскай зоны.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.** *lobazhevich@zviazda.by* ■

**ИЗМЕНЕНИЯ В ПРОЕКТНОЙ ДЕКЛАРАЦИИ ИООО «Датч Стар»,**

**опубликованной в газете «Звязда 26.09.2013 г. № 181, строительства многоквартирного жилого дома с подземной гараж-стоянкой (№ 1 по генеральному плану в квартале пр. Дзержинского – ул. Щорса – ул. Железнодорожная – ул. Хмелевского) со встроенными объектами обслуживания населения:**

«...Стоимость 1 кв.м для граждан, не нуждающихся в улучшении жилищных условий, квартиры, площадью **81,53 кв.м** на 16 этаже, **83,03 кв.м** на 18 этаже – *1300 (одна тысяча триста)* долларов США».

**Дополнительную информацию можно получить по адресу: г. Минск, ул. Немига, 40, офис 704. Тел.: 8 (017) 306 20 90, Vel.: 8 (029) 380 26 80, 8 (044) 781 81 17.**

УНП 191061436

**ОАО «РИП-АЧФА» приглашает на общее собрание акционеров, которое состоится 23 октября 2015 года в 14.00 по адресу: г. Минск, пр. Партизанский, 146а**

**В ПОВЕСТКУ ДНЯ ВКЛЮЧЕНЫ СЛЕДУЮЩИЕ ВОПРОСЫ:**

1. Утверждение ликвидационного баланса общества.

С информацией, подлежащей утверждению на годовом собрании, можно ознакомиться по местонахождению общества.

УНП 101030607

# ГАЙДУКЕВИЧ — СИЛЬНАЯ БЕЛАРУСЬ!

## Программа кандидата в Президенты Республики Беларусь Гайдукевича Сергея Васильевича

Уважаемые сограждане! Дорогие белорусы! Предвыборный штаб Сергея Васильевича **Гайдукевича**, председателя Либерально-демократической партии Беларуси, сердечно благодарит всех, кто поддержал выдвижение нашего лидера кандидатом в Президенты Республики Беларусь.

Мы знаем, что граждан, которые хотели подписаться за **Гайдукевича,** значительно больше, но по объективным причинам наши активисты не смогли прийти к каждому из Вас. Мы чувствовали огромную поддержку, это дало необходимые силы, и теперь у избирателей есть возможность проголосовать за Сергея Васильевича **Гайдукевича**.

Наш кандидат не обещает, а предлагает конкретные действия для улучшения ситуации в стране и повышения ее имиджа на международной арене. Предвыборная кампания кандидата на пост Президента Республики Беларусь Сергея Васильевича **Гайдукевича** проходит под лозунгом «За сильную Беларусь!». Основной слоган кампании — «Порядок в стране, достаток в доме». Ведь все мы хотим стабильности, процветания, роста благосостояния и социально-экономического развития страны. Такое возможно только в Сильной Беларуси, а Сильная Беларусь — это порядок в стране, достаток в доме!

### ВНУТРЕННЯЯ ПОЛИТИКА

**Гайдукевич** не разъединяет, а объединяет людей, и тем самым укрепляет суверенитет и независимость страны, способствует формированию новых возможностей для будущего Беларуси.

**Гайдукевич** считает необходимым провести ближайшие парламентские выборы по смешанной пропорционально-мажоритарной избирательной системе с участием всех конструктивных сил, настроенных на созидательную работу во благо граждан и Беларуси.

**Гайдукевич** сделает из чиновников — государственников! Беларуси нужны не клерки, а люди с государственным мышлением, инициативные управленцы, а не люди, боящиеся потерять «теплое» кресло. Государственник осознает всю личную ответственность перед Отечеством, отвечает за свои действия и не боится проявлять инициативу на пользу Родины.

**Гайдукевич** за расширение полномочий местных органов самоуправления и привлечение в общественно-политическую жизнь всех заинтересованных граждан.

**Гайдукевич** знает, какие реформы и преобразования нужны стране. Политический и управленческий опыт кандидата позволит провести курс изменений без потрясений.

**Гайдукевич** за сильное правовое государство, где понятия Свобода, Закон и Порядок не пустые слова.

**Гайдукевич** категорически против авантюризма в политике, потому что знает: любой эксперимент в политике — это эксперимент на людях.



**Гайдукевич** приветствует плюрализм интересов и идеологий, выступает за политическую конкуренцию, свободу торговли и уважает личную свободу.

**Гайдукевич** опирается на исторический опыт своего народа, не делит историю, не играет с историей и не воюет. Дорожит и уважает, осознает, что история — в будущем.

### СОЦИАЛЬНО-ЭКОНОМИЧЕСКАЯ БАЗА

**Гайдукевич** и Либерально-демократическая партия всегда защищали и будут защищать экономические интересы нашей страны.

**Гайдукевич** не приемлет ситуации, когда зарплаты растут, а реальный доход граждан падает. Необходимо реальное повышение доходов населения с ростом цен и недопущение периодов резкого падения реального уровня жизни людей. Надо приблизить минимальный размер оплаты труда к прожиточному минимуму.

**Гайдукевич** за доведение социальной (минимальной) пенсии до уровня прожиточного минимума и возрождение трудовой пенсии, в перспективе персонификацию пенсионных счетов и развитие системы негосударственного пенсионного обеспечения.

**Гайдукевич** считает необходимым серьезно повысить уровень социальных гарантий нетрудоспособным, особенно инвалидам и детям. Молодые семьи должны ощущать поддержку государства не на словах, а на деле. Жилье по доступным ценам, а работа за достойный заработок.

**Гайдукевич** остановит отток из страны молодых специалистов в различных сферах жизнедеятельности путем повышения оплаты их труда. Перспектива повышения зарплаты по выслуге лет не вызывает стремления у молодых специалистов, а лишь провоцирует их на выезд из страны.

**Гайдукевич** видит главной задачей в развитии экономики — переход к экономическому росту на основе стимулирования развития легального сектора экономики, способного обеспечить наполнение бюджета, и вытеснения теневой экономики. Экономического роста не может быть без инвестиций. Но инвестиций не будет без создания эффективного собственника, который заинтересован в долгосрочном развитии предприятия, а не «проедании» доходов от него.

**Гайдукевич** за развитие частной инициативы и окажет всяческую поддержку в развитии малого и среднего бизнеса. Бизнес — мотор экономики. Уже сейчас мы предлагаем с учетом экономической ситуации в целях стимулирования развития среднего и малого бизнеса передать пустующие административные помещения представителям среднего и малого бизнеса, освободив их от арендной платы на 3 года.

**Гайдукевич** знает, что стране нужно высокое качество и эффективность образования, его практическая жизненная направленность. Образование должно соответствовать потребностям личности, общества, страны.

**Гайдукевич** знает о проблемах предприятий, которые скатываются все ниже и ниже по качеству продукции, ее рентабельности, как на внутреннем, так и на внешнем рынке, ряд производств просто работают на забивку складов. Поэтому необходима модернизация и поддержка, но тех производств, которые реально могут конкурировать. Хватит вкладывать баснословные деньги в заведомо слабые предприятия.

**Гайдукевич** за качественную медицину и хорошее состояние здоровья нации, охрана здоровья нации — важнейшая задача руководителя страны.

В команде **Гайдукевича** профессионалы, люди дела, руководители успешных предприятий, специалисты в госуправлении, которые знают, что надо делать, чтобы экономика страны развивалась.

Но при этом **Гайдукевич** и его команда понимают, что популизм и пустые обещания сейчас не приемлемы, нужна ежедневная, планомерная работа всех нас на благо страны.

### ВНЕШНЯЯ ПОЛИТИКА

**Гайдукевич** знает, что жизненно необходимо держать паритет между Западом и Востоком, быть своеобразной восточнославянской Швейцарией. Отчетливо понимает, что Запад — наш Партнер, а Россия — Союзник. Нельзя делить нашу страну по Западной или Восточной параллели, нельзя стремиться к тому, чтобы Беларусь стала Восточным или Западным рубежом.

**Гайдукевич** осознает, что процессы глобализации и интеграции нужны для экономичного развития, но чтобы не очутиться под более сильной страной, необходимо сохранение национальной культуры, традиций, духа. Беларусь должна быть Суверенным, Независимым государством, даже во времена СССР мы имели свое представительство в ООН.

**Гайдукевич** будет проводить по-настоящему многовекторную политику, мы должны выстраивать взаимовыгодные отношения со всеми странами и на Западе, и на Востоке. Дружба с Западом не идет в разрез с дружбой с Востоком, ведь главное — национальные интересы.

**Гайдукевич** за отмену санкций. Никогда санкции и ограничения не способствовали развитию взаимоотношений! Пришло время делать шаги навстречу друг другу.

**Гайдукевич** сделает Беларусь крепким и надежным мостом между Западом и Востоком, Югом и Севером.

**Гайдукевич** за создание единого экономического пространства от Лиссабона до Владивостока.

**Гайдукевич** не делит Европу по Беларуси, ведь мы неотъемлемая часть европейской цивилизации. Вместе с тем с Россией у нас всегда было больше отношений. Так исторически складывались партнерские связи, это наша история.

**Гайдукевич** поддерживает интеграционные процессы на постсоветском пространстве. И Россия, и Украина, и Казахстан — наши братья. И развитие взаимоотношений между нашими странами — это большой плюс. Вместе с тем любые интеграционные образования, в том числе и с Россией, должны быть только равноправными и взаимовыгодными.

**Гайдукевич** уверен, что удержаться в Центре, перестать метаться между Западом и Востоком может только Сильная Беларусь, которой управляют государственники с ясной и четкой позицией. Путь у нас один — к Беларуси! Развивать и укреплять страну! Вот для этого нам нужны партнерские отношения с Западом и союз с Востоком, а не для решения каких-то амбиций.

Поддерживая Сергея Васильевича **Гайдукевича**, Вы поддерживаете многотысячную команду однопартийцев. Либерально-демократическая партия Беларуси объединяет 50 тысяч граждан, это самая мощная политическая сила республики. Наши активисты трудятся в различных сферах, где зарекомендовали себя как ответственные и профессиональные работники в государственных органах местной администрации, медицине, образовании, бизнесе и военном деле. Слышим каждого, знаем о проблемах не понаслышке и имеем бесценный опыт. С момента обретения независимости мы последовательно укрепляем фундамент страны, усердно вносим свой вклад, ведь знаем, как легко разрушать и трудно строить.

**Гайдукевич** — Сильная Беларусь, а Сильная Беларусь — порядок в стране, достаток в доме!

---

■ Пытанне — адказ

# ДЗЕ ЛЕКІ ТАННЕЙШЫЯ?



**У рэдакцыю паступіў ліст з пытаннем аб кошце лекавых сродкаў у аптэках дзяржаўнай і недзяржаўнай формаў уласнасці горада Віцебска. Вось вытрымкі з пісьма:**

*«...Да вас звяртаюцца жыхары самага буйнога мікрараёна Білева г. Віцебска. Мы бачым, што ў нашым мікрараёне ў апошні час адчыняецца ўсё больш аптэк... Цікава, што дзяржаўных удвая больш, чым камерцыйных... Мы жадаем лячыцца нашымі айчыннымі таблеткамі, яны больш надзейныя і павінны танней каштаваць. Але! Чамусьці кошт на беларускія лекі ў дзяржаўных аптэках (у нашым мікрараёне) вышэйшы, чым у камерцыйных. І гэта пры тым, што арэндная плата ў дзяржаўных аптэк значна ніжэйшая, чым у камерцыйных. Калі лічыць, што арэнда — асноўны артыкул затрат любога прадпрыемства, нам незразумела, адкуль тады такія цэны на лекі...».*

Тэма, закранутая ў лісце, вельмі актуальная і можа быць цікавай для іншых чытачоў, таму мы прадстаўляем адказ на яго. Аднак ліст аказаўся непадпісаным, а таму надалей нагадваем вам, шаноўныя чытачы, парадак звароту. Паводле артыкула 23 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб зваротах грамадзян і юрыдычных асоб» ад 18.07.2011 № 300-З (са зменамі і дапаўненнямі), ананімныя звароты не разглядаюцца, паколькі не змяшчаюць прозвішча, імя і імя па бацьку або ініцыялы, адрас месца жыхарства або знаходжання, месца працы, вучобы.

Тлумачэнні дала **намеснік генеральнага дырэктара Віцебскага РУП «Фармацыя» Ірына ДРУЖЫНІНА:**

— Сёння ў Віцебску функцыянуюць 54 аптэкі нашага прадпрыемства і 91 аптэка недзяржаўнай формы ўласнасці. Для забеспячэння даступнай і якаснай лекавай дапамогі жыхарам мікрараёна Білева арганізавана работа трох дзяржаўных аптэк:

— аптэка № 300 — пр. Маскоўскі, 109-2;

— аптэка № 288 — пр. Маскоўскі, 99;

— аптэка № 267 — вул. Багатырова, 20А.

Функцыянуюць у гэтым мікрараёне і тры аптэкі недзяржаўнай формы ўласнасці:

— аптэка № 53 ТАА «Іскамед» — вул. Багатырова, 28-109;

— аптэка № 10 ЗАТ «Кампанія «Інтэрфарм» — вул. Багатырова, 10/2;

— аптэка № 18 ТДА «Фарм-Прадукт» — пр. Маскоўскі, 130-1.

Фарміраванне цэн на Віцебскім РУП «Фармацыя» ажыццяўляецца згодна з Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 11.08.2005 № 366 «Аб фарміраванні цэн на лекавыя сродкі, вырабы медыцынскага прызначэння і медыцынскую тэхніку» (са зменамі і дапаўненнямі) без прымянення лімітава дапушчальных гандлёвых надбавак. Дадаткова ажыццяўляецца пастаянны маніторынг цэн на лекавыя сродкі, у тым ліку айчыннай вытворчасці, ва ўсіх аптэках Віцебска і Віцебскай вобласці.

Трэба заўважыць, што інфармацыя, прадстаўленая ў звароце, не адпавядае рэчаіснасці, бо з прыведзеных прыкладаў цэн толькі дзве пазіцыі *(мукасат, аспірын)* датычацца аптэкі, размешчанай у мікрараёне Білева (аптэка №53 ТАА «Іскамед», вул. Багатырова, 10/2). Усе астатнія датычацца аптэк, размешчаных у самых розных раёнах горада, і лекавыя сродкі па коштах, указаных на сайце tabletka.by, там фактычна адсутнічаюць, а ў наяўнасці ж — па коштах больш высокіх. Звесткі па наяўнасці і цэнах на лекі на згаданым сайце носяць азнаямленчы характар і ў кожным канкрэтным выпадку патрабуюць удакладнення па званку ў аптэку.

Кошт на ўказаныя ў звароце лекі ва ўсіх аптэках мікрараёна Білева прыблізна аднолькавы, і **ў большасці выпадкаў у дзяржаўных аптэках Віцебскага РУП «Фармацыя» ён ніжэйшы, чым у суседніх аптэках недзяржаўнай формы ўласнасці.**

Віцебскае РУП «Фармацыя» для забеспячэння даступнасці розным слаям насельніцтва і прыярытэтнасці цэн у дзяржаўным сектары ўкараніла сістэму зніжак на медыцынскія тавары для малазабяспечаных слаёў насельніцтва (інваліды, пенсіянеры, шматдзетныя сем'і) у памеры 10 працэнтаў ад рознічнага кошту па больш як 400 гандлёвых найменнях лекавых сродкаў айчыннай вытворчасці. Зніжка прадастаўляецца цягам усяго працоўнага часу ва ўсіх аптэках прадпрыемства пасля прад'яўлення пацвярджальнага дакумента.

Пытанне максімальнага набліжэння якаснай і даступнай лекавай дапамогі жыхарам Віцебска, у тым ліку новага мікрараёна Білева, знаходзіцца на пастаянным кантролі. Ніякіх прэферэнцый у першачарговым прадастаўленні плошчаў для арганізацыі работы новых аптэк або зніжэнні арэнднай платы Віцебскае РУП «Фармацыя» не мае.

Атрымаць інфармацыю аб наяўнасці і кошце лекавых сродкаў у аптэках Віцебскага РУП «Фармацыя» можна па нумары даведачнай службы 169.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**
*protas@zviazda.by*

ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

22 ВЕРАСНЯ 2015 г.
АЎТОРАК
№ 18 (15777)

Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Бачыць мэту

# Шляхам самапазнання



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

**Маладыя пішуць пра маладых і для маладых. Гэта прынцып «Чырвонкі. Чырвонай змены», якая па сваёй сутнасці з'яўляецца творчай пляцоўкай для таленавітых юнакоў і дзяўчат: школьнікаў, абітурыентаў, студэнтаў, маладых спецыялістаў, што хочуць звязаць або ўжо звязалі свой лёс з журналістыкай. Сапраўды, каму, як не ім, лепш за іншых ведаць і разумець, чым жывуць іх аднагодкі, якія праблемы найперш турбуюць тых, хто стаў на шлях самапазнання? І хто, як не яны, здольныя ў першую чаргу зразумелай мовай данесці свае думкі і памкненні да равеснікаў?**

**Гэтымі днямі пройдзе форум маладых журналістаў, дзе такая ж магчымасць будзе ў тых, хто, нягледзячы на свой узрост, ужо мае за плячыма пэўны жыццёвы і прафесійны досвед і гатовы падзяліцца ім з такімі ж неабыякавымі, крэатыўнымі, няўрымслівымі калегамі-равеснікамі. Напярэдадні гэтай сустрэчы «Чырвонка. Чырвоная змена» падрыхтавала спецыяльны выпуск, каб яшчэ раз даць слова тым, хто ў наступныя гады будзе жыць і тварыць на «вастрыні часу».**

**На здымку: Гэтыя прыгожыя, абаяльныя маладыя юнакі і дзяўчаты — студэнты першага курса Інстытута журналістыкі БДУ. Яны пакуль шчаслівыя толькі ад таго, што паступілі. Наперадзе іх чакаюць гады вучобы і практыкі, падчас якіх давядзецца спасцігаць як жыццёвую, так і прафесійную мудрасць. Часам, магчыма, будзе нялёгка. Але мы ўпэўнены, што сярод гэтых першакурснікаў ёсць і будучыя ўдзельнікі далейшых форумаў маладых журналістаў. Прынамсі, сваіх будучых калег па рэдакцыі на здымку мы дакладна бачым. Можаце не сумнявацца!**

**Сяргей РАСОЛЬКА.** *rs@zviazda.by*

Век вучыся

# «ЗОРНАЯ ХВАРОБА» НЕ СПРЫЯЕ РАЗВІЦЦЮ

## У гэтым перакананы першы намеснік старшыні Беларускага саюза журналістаў Вадзім Гігін

**Падчас інтэрв'ю галоўны рэдактар часопіса «Беларуская думка», які з'яўляецца адным з арганізатараў і пастаянных удзельнікаў форуму маладых журналістаў, не толькі расказаў пра асаблівасці сёлетняй «вучобы», але і падзяліўся ўласнымі поглядамі на журналістыку.**

***— Вадзім Францавіч, чым чацвёрты форум будзе адрозніваецца ад папярэдніх трох?***

— Па-першае, ён будзе самым масавым. Гэта і зразумела: Год моладзі як-ніяк. Па-другое, пленарная частка пройдзе не ў традыцыйнай форме, калі выступоўцы адзін за адным выходзяць на трыбуну і нешта кажуць, а затым ім задаюць пытанні. Хочам даць слова непасрэдна самім маладым журналістам. І зрабіць гэта ў форме дэбатаў, падчас якіх моладзь будзе ўздымаць вострыя пытанні, што стаяць перад нашай прафесіяй. Яны адбудуцца з удзелам ганаровых гасцей. У якасці экспертаў выступяць вядомыя майстры слова. Дарэчы, праект БРСМ «Выбірай.BY» узняў сапраўдную хвалю маладзёжных дэбатаў. Ужо не раз даводзілася праводзіць такія дыскусіі, і гэта насамрэч узрушвае. Маладыя людзі ў прысутнасці высокіх дзяржаўных кіраўнікоў уздымаюць самыя надзённыя праблемы, якія тычацца выбарчага працэсу, кадравай палітыкі, эканомікі і г.д. І самі ж знаходзяць адказы, уступаюць у дыялог з міністрамі, дэпутатамі, старшынямі выканкамаў. Усё праходзіць у вострай, але добразычлівай атмасферы. Цяпер чарга дайшла да журналістыкі. Упэўнены, атрымаецца цікава і карысна.

Акрамя таго, на базе канкрэтных рэдакцый і інфармацыйных агенцтваў пройдуць выязныя трэнінгі. Ну і вядома, па добрай традыцыі Беларускі саюз журналістаў агучыць вынікі конкурсу для журналістаў-пачаткоўцаў «Дэбют», які, дарэчы, быў заснаваны адначасова з першым форумам. Радуе, што прозвішчы пераможцаў застаюцца на слыху і праз тры гады: гэта сведчыць, што журналістыка — іх свядомы выбар. Сёлета конкурсных работ прыйшло надзвычай шмат. Нашаму Камітэту па этыцы і прэміях прыйшлося шмат папрацаваць. Вельмі добра, што маладыя журналісты з раёнак і абласных рэдакцый, мясцовых тэлерадыёкампаній складаюць канкурэнцыю прадстаўнікам агульнанацыянальных масмедыя. Гэта сведчыць, што ў прафесію прыйшло добрае і таленавітае пакаленне.



*(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)*

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
22 09 2015 г.

# «ЗОРНАЯ ХВАРОБА» НЕ СПРЫЯЕ РАЗВІЦЦЮ

**(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)**

***— Вы неяк казалі, што не лічыце сябе журналістам у поўным сэнсе гэтага слова...***

— Так, бо ў мяне няма адпаведнай адукацыі. Я скончыў гістарычны факультэт...

***— Але ж, тым не менш, вы ўзначальваеце часопіс, пішаце не толькі навуковыя, але і публіцыстычныя артыкулы, ведзяце ток-шоу на тэлебачанні. Атрымліваецца, каб дасягнуць поспеху ў прафесіі, журналісцкая адукацыя зусім неабавязковая?***

— Ёсць некалькі падыходаў. Наш, савецкі (ён прысутнічае і ў некаторых іншых краінах), згодна з якім журналістыцы трэба навучацца ва ўніверсітэце. І іншы: калі гэта рабіць не трэба, а журналістамі працуюць спрэс людзі з педагагічнай, філалагічнай ці іншай адукацыяй. Асабіста я лічу, што тут павінна быць нейкая залатая сярэдзіна. Вучыцца, безумоўна, трэба, бо калі ты не ведаеш асновы рамяства (структуру артыкула, жанры і г.д.), будзе цяжкавата.

Але ці трэба вывучаць журналістыку 5 гадоў? Гэта дыскусійнае пытанне. Тое ж, што, незалежна ад адукацыі, рэальна дабіцца поспехаў у журналістыцы, доказвае само жыццё. Так, на маіх вачах міліцыянер, які ў 45 гадоў пайшоў на пенсію, стаў выдатным крымінальным аглядальнікам. Многія спартсмены пасля таго, як заканчвалі сваю кар'еру, рэалізоўваліся ў спартыўнай журналістыцы. Яны ведаюць тое, пра што пішуць, знутры, таму іх тэксты атрымліваюцца глыбокімі.

***— Ці з'яўляецца ўзрост, на ваш погляд, перашкодай для журналіста ў плане самарэалізацыі ў прафесіі?***

— Зразумела, не. Калі ў маладога чалавека ёсць талент, арганізатарскія здольнасці, што можа стаць для яго перашкодай? Не хацелася б зараз прыводзіць хрэстаматыйныя прыклады з іншых галін. Скажам прасцей. Чалавек апантаны, які верыць у свае сілы, упэўнены ў тым, што ён робіць, — праб'ецца. І ўсё ж таленту трэба дапамагаць. Вось як яго заўважыць, не прапусціць у мітусні дзён? Гэта пытанне. Менавіта на дапамогу таленавітым людзям у нашай прафесіі накіраваны форум маладых журналістаў і прэмія «Дэбют». Упэўнены, і сёлета з'явяцца новыя імёны, якія неўзабаве стануць гонарам айчыннай журналістыкі.

**«Трэба заўжды вучыцца, глядзець, як робяць іншыя, аналізаваць. А апускаць рукі, на мой погляд, увогуле не варта ні ў якой сітуацыі. Які сэнс? Трэба ісці наперад і верыць у свае сілы».**

***— Ёсць журналісты, якія толькі год-два як скончылі ўніверсітэт, але для іх ужо характэрна «зорная хвароба». Наколькі важна маладому чалавеку крытычна ставіцца да сябе?***

— Крытычна ставіцца да сябе, лічу, важна ў любым узросце і ў любой прафесіі. Працытую вядомыя словы Канстанціна Сяргеевіча Станіслаўскага: «Здолейце любіць мастацтва ў сабе, а не сябе ў мастацтве». На мой погляд, гэтае правіла і ёсць самая лепшая прышчэпка ад усялякай «зорнасці». Ды і жыццё хутка ставіць на месца тых, хто адрываецца ад зямлі, ад інтарэсаў людзей, для якіх мы з вамі працуем.

І менавіта чытачы, гледачы, слухачы выносяць канчатковае рашэнне: ёсць талент альбо не. Самае галоўнае для журналіста, у тым ліку маладога, не страціць адчуванне рэчаіснасці, пульс часу. Быць сучасным — гэта не значыць быць модным. Бо тая ж мода можа завесці далёка не ўперад, а зусім у іншым накірунку. Таму і пэўны кансерватызм павінен прысутнічаць.

Паглядзіце, колькі бруду некалі вылілі на савецкую журналістыку! Але сёння мы вучымся на прыкладах Аграноўскага, Зорына, Бовіна, Булацкага, Матукоўскага. Дарэчы, гэтыя людзі былі вельмі незвычайныя як асобы, але зусім далёкія ад зорнасці. У іх было чалавечае абаянне, а не танныя «панты».

***— Не сакрэт, што Беларускі саюз журналістаў клапоціцца не толькі пра моладзь, але і пра «акул пяра». Старшыня творчага аб'яднання Анатоль Іванавіч Лемяшонак, у якога неадназова даводзілася браць інтэрв'ю, заўсёды казаў пра важную ролю інстытута настаўніцтва ў журналістыцы. А хто быў вашым настаўнікам, чалавекам, які дапамог упэўнена стаць на творчае крыло?***

— Сапраўды, вельмі важна, каб маладому чалавеку, які прыйшоў у рэдакцыю, нехта дапамог, падтрымаў, без зайздрасці накіраваў, падказаў, на каго трэба арыентавацца. На шчасце, у Саюзе журналістаў ёсць такія людзі. У якасці прыкладу прывяду Георгія Сцяпанавіча Тамашэвіча, які шмат гадоў узначальваў брэсцкую арганізацыю. Ён, дарэчы і сам стаў адным з першых журналістаў-настаўнікаў, арганізаваў папулярызацыю гэтага вопыту. З яго лёгкай рукі інстытут настаўніцтва паспяхова развіваецца ў тым ліку і ў раённых газетах.

Дарэчы, для калег старэйшага пакалення вось ужо чацвёрты год праводзіцца конкурс «Журналіст-настаўнік». Мы надаём яму не менш увагі, чым «Дэбюту». Клапоціцца пра гэты напрамак дзейнасці Беларускага саюза журналістаў вельмі дасведчаны чалавек — наш адказны сакратар Сяргей Дзмітрыевіч Сверкуноў.



Што тычыцца асабіста мяне, то я вельмі ўдзячны свайму настаўніку (не толькі ў навуцы, але і па жыцці) — доктару гістарычных навук, прафесару Мікалаю Стэфанавічу Сташкевічу. А ў журналістыцы, напэўна, Паўлу Ізотавічу Якубовічу. Было так. Не паспеў я ўзначаліць «Беларускую думку», як гендырэктар БелТА Дзмітрый Аляксандравіч Жук зладзіў для мяне своеасаблівы іспыт: папрасіў зрабіць вялікае інтэрв'ю для часопіса з галоўным рэдактарам «Советской Белоруссии». Гэта было маё першае сур'ёзнае інтэрв'ю і бясцэнныя ўрокі рэдактуры. Павел Ізотавіч, здаецца, разы чатыры вычытваў тэкст. Не крытыкаваў, а проста браў аловак і правіў. Адначасова вельмі добразычліва і з тактам раіў, як арганізаваць працу рэдакцыі. Трэба заўжды вучыцца, глядзець, як робяць іншыя, аналізаваць. А апускаць рукі, на мой погляд, увогуле не варта ні ў якой сітуацыі. Які сэнс? Трэба ісці наперад і верыць у свае сілы. Калі верыш, то ў выніку ўсё атрымаецца.

***— Гумарыстычнае выказванне «Чукча не чытач, чукча — пісьменнік» журналісты часта прымяняюць датычна да сябе, калі высвятляецца, што нехта з іх не чытае тэксты сваіх жа калег. Тым не менш не сакрэт, што для таго, каб выпрацаваць свой стыль, недастаткова варыцца ва ўласным соку. Што вы параіце пачытаць маладым журналістам?***

— Хаця б проста чытаць. Без гэтага немагчыма адбыцца ў прафесіі. На жаль, сёння мала чытае не толькі моладзь... Хаця, ведаеце, можа маладыя якраз і чытаюць. Не раз даводзілася сустракацца з маладой чытацкай аўдыторыяй. І хлопцы, і дзяўчаты былі ў курсе апошніх літаратурных навінак. А часам пагаворыш з якім-небудзь чыноўнікам, альбо бізнесменам... Так, зразумела, будні заядаюць, шмат працы. І ўсё ж трэба пакідаць час, каб развівацца як асоба. А гэта немагчыма без кнігі. Няважна, друкаванай ці электроннай.

Асабіста на мяне вялікае ўражанне зрабіў «Ціхі Дон» Шолахава — нічога лепшага ў жыцці не чытаў. Цяпер вельмі шмат чытаю кніг па гісторыі, палітыцы, рэлігіі, мемуараў. Ну і, вядома, не буду арыгінальным, ёсць агульны набор сусветнай класічнай літаратуры, якую трэба было б вывучыць. Магу назваць сваіх любімых аўтараў. З беларускіх — Купала, Багдановіч, Шамякін, Быкаў і Караткевіч. А верш Канстанцыі Буйло «Люблю» магу чытаць і слухаць бясконца. З рускіх — Ясенін, Чэхаў, Зошчанка, Булгакаў. Вельмі люблю лаціна-амерыканскую літаратуру, у прыватнасці Борхеса, Амаду. І сёння ўзгадваю тую асалоду, калі на адным дыханні прачытаў «100 гадоў адзіноты» Маркеса.



Для мяне ў літаратуры важныя арыгінальная ідэя і падача матэрыялу. Прапісныя ісціны, якія гавораць у лоб, як трэба рабіць, а як не, чытаць складана і непрыемна. Наколькі начытанасць уплывае на журналісцкі стыль, цяжка сказаць. Але, несумненна, журналіст павінен мець шырокі кругагляд.

***— Гістарычная адукацыя, напэўна, вельмі дапамагае пры напісанні тэкстаў, дазваляе свабодна праводзіць паралелі паміж мінулым і сучаснасцю?***

— Яна ўвогуле дапамагае па жыцці. Нават у кампаніі гістарычны анекдот расказаць — у мяне іх цэлая калекцыя. Гісторыя — класічная адукацыя, якая ўпарадкоўвае мазгі. Ты на многія рэчы больш сістэмна глядзіш. Да таго ж яна і памяць добра развівае. Хаця вельмі шмат спрэчак вакол таго, а што ж такое гісторыя. Навука? Нешта больш блізкае да літаратуры і філасофіі? З майго пункту гледжання — навука, прычым даволі дакладная. Тое, што яна мае вялікае грамадскае значэнне, толькі падкрэслівае адказнасць вучоных. Дарэчы, тут вельмі шмат агульнага з журналістыкай.

Да нас, гуманітарыяў, некаторыя ставяцца з пагардай. Маўляў, кожны можа гэтым займацца. Не атамы ж расшчапляць! А бяруцца — потым такога панавыкручваюць... Усё ж такі любое слова — навуковае, публіцыстычнае, нават у справаводстве (можа, там яшчэ і болей) — патрабуе акуратнасці і павагі. За словам стаяць лёсы людзей.

**«Таленту трэба дапамагаць. Вось як яго заўважыць, не прапусціць у мітусні дзён? Гэта пытанне. Менавіта на дапамогу таленавітым людзям у нашай прафесіі накіраваны форум маладых журналістаў і прэмія "Дэбют"».**

***— Мне вельмі прыемна, што вы адказваеце на мае пытанні па-беларуску. Як лічыце, павінен журналіст ведаць дзве мовы ці ўсё ж такі дастаткова адной?***

— Родную мову чую і ведаю з дзяцінства. Праўда, мы не размаўлялі ў Смілавічах, адкуль я родам, на літаратурнай беларускай, хутчэй на «трасянцы». Аднак асобныя рэчы і паняцці называліся выключна па-беларуску — хата, сенцы, брама.

Усё павінна быць натуральна. Двухмоўнасць — гэта рыса нашага народа. Мы павінны ганарыцца тым, што можам думаць на дзвюх мовах, карыстацца гэтым. Лічу, што кожны беларус, які паважае сябе, незалежна ад прафесіі, павінен ведаць як мінімум беларускую і рускую. А ўвогуле, чым больш чалавек ведае моў, тым лепш.

**Надзея ДРЫЛА.**
*dryla@zviazda.by*

# ПРАГРАМА З «РАЗЫНКАЙ»

**Узгадваюць удзельнікі папярэдніх форумаў маладых журналістаў:**

**Алеся ГЛУХАВА, галоўны рэдактар газеты «Веснік Чэрыкаўшчыны»:**

— Мне пашчасціла два разы запар прымаць удзел у форуме. І кожны раз у ім была свая «разынка», вельмі цікавая і насычаная праграма. У 2013 годзе калег сустракаў Магілёў. І мне разам з Паўлам Савельевым, рэдактарам шклоўскай раёнкі (на той момант мы былі самымі маладымі кіраўнікамі СМІ на Магілёўшчыне), даверылі сказаць словы ўдзячнасці арганізатарам і ўдзельнікам форуму ад імя боку, які прымаў. Гэта было вельмі адказна і прыемна. Асабіста я ўдзячна арганізатарам форуму перш за ўсе за шыкоўную магчымасць сустрэцца са сваімі выкладчыкамі, былымі аднакурснікамі (тымі, хто застаўся ў прафесіі), старэйшымі калегамі, у якіх насамрэч ёсць чаму павучыцца. Варта таксама адзначыць цікавую праграму па-за межамі журналістыкі, дзякуючы якой госці пазнаёміліся з Магілёвам і яго традыцыямі.

**Алена ДРАПКО, карэспандэнт газеты «Звязда»:**

— Для сябе падчас II беларуска-расійскага форуму маладых журналістаў «Агульны погляд у будучыню» даведалася шмат новай карыснай інфармацыі. Запомнілася дыскусія, на якой падымаліся цікавыя пытанні: «Як добраму журналісту не апусціцца да ўзроўню блогера?», «Дзе шукаць навінавы сюжэт?», «Ці ёсць будучыня ў друкаваных СМІ?»... На працягу двух дзён мы ўдзельнічалі ў конкурсах, сацыялагічных апытанках, наведвалі майстар-класы ад вядомых у медыясферы экспертаў. Шкада толькі, што яны праводзілі свае майстар-класы адначасова ў розных залах. Даводзілася літаральна разрывацца, бо хацелася паслухаць кожнага! Парадавалася за сваю калегу і сяброўку Настассю Кодзіс, якая перамагла ў конкурсе Беларускага саюза журналістаў «Дэбют» як найлепшы рэпарцёр. Цудоўна, што такія конкурсы ладзяцца менавіта для маладых журналістаў. Гэта стымул удасканальвацца ў прафесіі і надалей.

**Аляксей НАУМАВЕЦ, карэспандэнт газеты «Драгічынскі веснік»:**

— Форум маладых журналістаў — безумоўна, мерапрыемства патрэбнае і карыснае. Вы ўяўляеце, як важна маладому журналісту з Драгічына ці Нароўлі пазнаёміцца з такім жа маладым журналістам з Масквы, Бранска, Пскова, Кіева, атрымаць магчымасць абмяняцца меркаваннямі?! Гэта каласальная вучоба, нават калі яна цягнецца ўсяго два дні. Ды і часта, у мітусні, нам папросту не хапае часу на тое, каб пазнаёміцца з работай калег-журналістаў. Тых, з кім зусім нядаўна разам рабілі першыя крокі ў прафесіі, рупліва ведучы канспекты на родным журфаку... Цяпер мы выраслі, узмужнелі. І кожны спрабуе знайсці сваю нішу, сваё месца на бязмежных журналісцкіх прасторах. Таму форум маладых журналістаў асабіста для мяне — гэта выдатная магчымасць пабачыць старых добрых таварышаў, абмяняцца з імі вопытам і, вядома, запазычыць шмат новай карыснай інфармацыі на разнастайных брыфінгах, майстар-класах, сустрэчах з вопытнымі калегамі-спікерамі. З нецярпеннем чакаю чарговую вучобу, бо за папярэднія гады ўдалося пазнаёміцца з найцікавейшымі людзьмі. Тымі, з кім мы разам працуем на карысць айчыннай журналістыкі!

*Мае героі*

# НЕ СТАРЭЮЦЬ ДУШОЙ ВЕТЭРАНЫ

**...Ціхая раніца ў аэрапорце. Мы чакаем самалёт, які паімчыць нас у Маскву. А адтуль будзе іншы — на Курск. Лаўлю сябе на думцы: навошта 90-гадоваму ветэрану, франтавіку, ляцець так далёка, ды яшчэ з перасадкай? І толькі пасля разумею — ён хоча пакланіцца зямлі, на якой загінулі сотні тысяч байцоў, а ён... выжыў.**

Сёння Аляксандру Фёдаравічу Феню амаль 92. І ён — САПРАЎДНЫ ветэран! (А што, бываюць іншыя?) Камандзір танка ў Сталінградскай бітве, удзельнік бітвы пад Курскам. Вызваляў Украіну, Беларусь, Румынію, Літву, Латвію. Асабіста знішчыў 12 танкаў праціўніка. На парадным кіцелі франтавіка — 7 баявых ордэнаў і 28 медалёў! Ён, актывіст ветэранскай арганізацыі, часта запрашае мяне на шматлікія мерапрыемствы. Я, у сваю чаргу, не раз была ў яго ў гасцях. Сёлета генералмаёр у адстаўцы ледзь не першы павіншаваў мяне з 8 Сакавіка! Мы сябры.

Мне 24 гады. І я сябрую з... ветэранамі. Усе яны — героі маіх публікацый.

Дзеля таго, каб матэрыял выйшаў у свет, я сустракаюся з кожным з іх мінімум тры разы (і няважна, на якім канцы горада ён жыве). Першы — калі знаёмімся, гутарым, запісваем інтэрв'ю. Другім разам мы чытаем, што атрымалася, яшчэ да выхаду публікацыі ў друк (вядома, дзякуючы інтэрнэту гэта можна было б зрабіць хутчэй, але ветэраны і камп'ютар — паняцці несумяшчальныя). Трэцяя сустрэча — самая важная і нават урачыстая: я прыношу ветэрану свежую газету, цукеркі, і мы, задаволеныя зробленай справай, п'ём гарбату — у нас свята.

Валянціна Паўлаўна Чудаева, у вайну камандзір зенітнага разліку, пры нашай першай сустрэчы частавала мяне клубніцамі са ўзбітымі вяршкамі. Такой смакаты я дагэтуль не ела! Лежачы на бальнічным ложку, яна расказвала пра лёс жанчын на вайне, пра трагедыю сваёй сям'і, пра нагу, якую маглі ампутаваць... Я не магла зразумець, што цягне мяне да гэтай малазнаёмай жанчыны, нават бабулі. Праўда, бабуляй яе назваць складана: нягледзячы на 90-гадовы ўзрост, раненні і пасляваенныя хваробы, у ёй столькі жаноцкасці і прыгажосці — і знешняй, і душэўнай. Пра яе пісалі не адзін раз (у сваёй кнізе «У вайны не жаночы твар» Святлана Алексіевіч прысвяціла Валянціне Паўлаўне цэлы артыкул), але маёй публікацыяй яна даражыць найбольш (прынамсі, мне так кажа). І сёння, як не патэлефаную, здзіўляецца: як такая «маленькая дзяўчынка» магла так напісаць. Кліча ў госці — і я кідаю ўсе справы і імчу.

Аляксандр Якаўлевіч Корсак, удзельнік Сталінградскай бітвы, у госці не запрашае. Але вельмі задаволены, калі прыходжу сама. Надзвычай расчуліўся, калі напярэдадні 9 Мая завітала да яго з цюльпанамі. Акрамя школьнікаў, больш не было каму... Яшчэ раней, падчас падрыхтоўкі публікацыі пра ветэрана, выпадкова знайшла ўзнагародны ліст Аляксандра Корсака. Паказала яму. Нечакана Аляксандр Якаўлевіч расплакаўся. Аказалася, што толькі цяпер, праз 70 гадоў пасля вайны, ён даведаўся, што быў не звычайным радавым, як заўсёды думаў, а старшыной медыцынскай службы. Копія ўзнагароднага ліста захоўваецца цяпер у кватэры ветэрана як своеасаблівая рэліквія. І мне прыемна, што ўнесла ў яго адзінокае жыццё хоць крышачку радасці.

Часам і ад іх, маіх ветэранаў, можна чакаць сюрпрызаў. Прыйшла на днях у рэдакцыю з шыкоўным букетам руж. Калега, які сядзіць у адным кабінеце са мной і ведае, да каго збіралася на інтэрв'ю, пытаецца: «Для Слабады?» — «Ад Слабады», — адказваю я, шчаслівая. Франтавік і партызан, Герой Сацыялістычнай Працы Аляксандр Іванавіч Слабада, калі я прыйшла да яго вычытваць публікацыю, без кветак не хацеў адпускаць. «Ад кавалера?» — пыталіся іншыя. «Ага! Ад 95-гадовага...»

«Колькі гадоў ветэрану, да якога сёння збіраешся?» — часта пытае мяне мама. А я стамляюся паўтараць, што амаль усім ім ужо не менш дзевяноста... «І як у цябе цярпення хапае па 3—4 гадзіны іх слухаць!» — здзіўляюцца іншыя. Маўляў, табе трэба помнік паставіць. Не мне. А ім. Кожнаму — па помніку! Я іх люблю ўжо за тое, што яны ёсць!



**Вераніка КАНЮТА, 24 гады, спецыяльны карэспандэнт газеты «Звязда». Творчае крэда: «Пісаць так, каб потым не было сорамна»**

*Ракурс сумлення*

# ЗДЫМАЦЬ — І МЭТА, І СРОДКІ, І СТЫЛЬ...

**...Нягледзячы на ўсе забароны, у вёсцы ў той дзень палілі сухую траву. Толькі не па правілах пажарнай бяспекі, вось і панёс вецер полымя на жылыя дамы. Пажарныя прадухілялі магчымую бяду — тушылі агонь.**

А два юнакі не знайшлі нічога больш карыснага, як зняць кароткаметражны фільм кшталту «як ледзь не згарэў мой дом».

А што рабіў ты ў гэты час? Такое пытанне задасць любы разумны чалавек, што пабачыць відэа. Здымаў на планшэт полымя, якое ідзе акурат да твайго дома?! Для чаго? Каб пасля ўзняць свой рэйтынг у сацыяльных сетках?

Мы ўвогуле надта любім здымаць усё, што адбываецца ў нашым жыцці: «Вось гэта я сёння ем», «А гэта я сёння п'ю», «Мой сабака, ён вось так брэша». Колькі ў вашым тэлефоне, смартфоне або планшэце непатрэбнага відэа і бессэнсоўных фота? Мо таму такія дарагія сёння нашаму сэрцу фотаздымкі бабуль і прадзедаў, што іх было мала, а засталося яшчэ менш?

Адна з колішніх суразмоўцаў, ветэран вайны, прызналася, што не кожны з іх дывізіі мог дазволіць сабе фотаздымак у ваенныя часы, надта ж дарагія яны былі. І тыя фота, што жанчына так беражліва захоўвае ў пажоўклым альбоме, яна нікому і ніколі нават у рукі не дае. Некалькі з іх — падарунак камандзіра. Ён даў грошы дзяўчыне на фотаздымкі, калі пабачыў, як хацелася ёй трапіць у кадр, а пасля паказаць фотаздымак сям'і.

А што мы пакінем нашым дзецям? Безліч сваіх фота ў адным адзенні, у тым жа пакоі, толькі з рознымі выразамі твару. «Тут яна ўсміхаецца, а тут яна такая ўся задуменная... Гэта, дарэчы, мама фота на аватарку ў сацыяльныя сеткі калісь здымала...» І якая каштоўнасць гэтых фота?

Быў у маім жыцці адзін паказальны эпізод, калі пачуццё чалавечнасці і інстынкт самазахавання прайгралі звычайнай чалавечай цікаўнасці і прагі да грошай. Я апынулася на гала-канцэрце, прысвечаным святкаванню Дня Незалежнасці краіны ў 2008-м. Калі хто не памятае, менавіта тады, 3 ліпеня, прагрымеў той самы першы выбух...

Жыхарка маленькага горада, якая ўпершыню ўбачыла сталіцу сваімі вачыма, я нават прыйсці ў сябе пасля выбуху не паспела, як усе навокал пачалі здымаць на тэлефоны людзей, што забіліся ў паніцы. У кампаніі «aператараў» аказаўся і мой знаёмы — будучы журналіст якраз праходзіў курсы падрыхтоўкі да паступлення ў Інстытут журналістыкі. Першы ўрок ён добра запомніў — журналіст заўсёды і ўсюды павінен быць першым. Таму Ваня (назавем яго ўмоўна так), як мог, прабіваўся праз натоўп, каб зрабіць «гарачыя кадры» з месца падзей.

Траплялі ў гэтыя кадры акрываўленыя людзі, якія курчыліся ад болю і клікалі на дапамогу. А над імі, схіліўшыся, сталі дзясяткі такіх «aператараў», як Ванька.

— Што ты робіш? — выкрыкнула я.

— Чым я ім дапамагу? — нібы не разумеючы, сказаў знаёмы. — А гэтыя кадры я заўтра ці ўжо сёння ноччу прадам на тэлебачанне, ведаеш, за якія грошы?

Кроў і слёзы людзей ніводзін дзяржаўны тэлеканал не пакажа. Прадаць іх Іван можа толькі якому «жоўтаму сайту», і будуць пасля сотні разявак глядзець на чужую трагедыю. А я і без ніякай камеры назаўсёды запомніла твар аднаго з пацярпелых — хоць бачыла яго некалькі секундаў, а забыць не магу. А таму ведаю цяпер, які твар у болю і якія вочы ў страху. І няхай Бог беражэ нас ад такіх гора-аператараў у цяжкія хвіліны. Няхай трапляюцца нам толькі тыя, хто словам і справай дапаможа ў такі момант, а не дастане з кішэні смартфон.



**Наталля ГЕРБЕДЗЬ, 24 гады, карэспандэнт газеты «Івацэвіцкі веснік» і праграмы радыёвяшчання «Раённае радыёвяшчанне». Творчае крэда: «Не хлусіць нават самой сабе!»**

*Не быць убаку*

# ДАПАМАЖЫ НЕ СЛОВАМ, А ЎЧЫНКАМ!



**Алеся САМАТОЙ, 28 гадоў, вядучы карэспандэнт газеты «Віцьбічы». Творчае крэда: «Любі тое, што робіш, і ўсё атрымаецца»**

**Люблю сустракацца на мерапрыемствах з калегамі-журналістамі, абмяркоўваць апошнія падзеі ў грамадстве, цікавіцца іх падыходам да падрыхтоўкі пэўнага матэрыялу. Прыемна бачыцца і ў нефармальнай абстаноўцы, напрыклад, на розных творчых і спартыўных спаборніцтвах, якія ў Віцебскай вобласці арганізуе для маладых журналістаў БРСМ. Тады асабліва адчуваеш, якая моцная каманда мы ўсе, калі разам. А нядаўна я задумалася... Як было б здорава, калі б сумесную энергію мы накіроўвалі на добрыя справы, каб кожны журналіст хаця б на некаторы час станавіўся валанцёрам!..**

Вось, напрыклад, мы часта рыхтуем матэрыялы з розных дабрачынных акцый, свят, якія адзначаюцца ў дзіцячых дамах, тэрытарыяльных цэнтрах, бальніцах. Безумоўна, журналісты робяць добрую справу, калі расказваюць чытачам пра неабыякавых да чужой бяды людзей. А што перашкаджае нам самім рабіць дабро і дапамагаць не толькі друкаваным словам, але і ўчынкамі? Згадзіцеся, тады і матэрыял атрымаецца больш цікавым, калі ты праслухнеш тым, пра што пішаш, станеш часткай падзеі.

Ёсць у нас у «Віцьбічах» традыцыя — да Новага года мы з калегай рыхтуем матэрыял пад рубрыкай «Добрыя справы». І, адпаведна, перад тым, як яго напісаць, гэтыя добрыя справы робім. І хай яны не вельмі маштабныя, але вядома, што з маленькага ўчынку пачынаюцца вялікія здзяйсненні. Напрыклад, мы традыцыйна сустракаем з радзільнага дома шматдзетную маці. Прычым, зусім незнаёмую! Малюем плакаты з імем нованароджанага, надзімаем паветраныя шарыкі, купляем неабходныя сродкі гігіены для немаўляці. Уявіце, які гэта прыемны сюрпрыз!

Аднойчы давялося дапамагчы чалавеку без пастаяннага месца жыхарства звязацца з сынам, з якім ён не кантактаваў некалькі гадоў з-за канфлікту — у выніку яны памірыліся і сям'я ўз'ядналася.

Вельмі кранальным быў наш візіт да адзінокай бабулі, нашай суседкі па пад'ездзе. Ёй мы вырашылі падарыць сапраўдны Новы год. Жанчына ўжо даўно сустракала свята без яго галоўнага атрыбута... Прыйшлі з елкай, цацкамі і іншымі ўпрыгажэннямі для яе. Атрымаўся цёплы, дамашні вечар.

Ёсць у нас сям'я, да якой мы таксама прыходзім у госці з падарункамі. У ёй маладая мама выхоўвае дачушку Крысціну з дыягназам ДЦП. І кожны раз мы расказваем на старонках газеты пра тое, якія добрыя перамены адбываюцца ў здароўі дзяўчынкі дзякуючы яе жаданню стаць на нагах і імкненню дасягнуць гэтай мэты ўсімі сродкамі!

Напэўна, кожны ў Віцебску чуў гісторыю маленькай Насці Піцерскай, якая таксама змагалася з цяжкай хваробай. Аднойчы я задала сабе пытанне: «А ці магу я штосьці-небудзь зрабіць, акрамя таго, што напішу заклік аб дапамозе ў газеце?» Разам з двума валанцерамі мы арганізавалі спецыфічную акцыю — збіралі сродкі на лячэнне дзяўчынкі ў начным клубе. За вечар атрымалася сума ў чатырыста долараў. Няшмат? А з іншага боку, кожны мог бы далучыцца да гэтай справы, прыдумаць арыгінальныя формы правядзення такіх акцый.

Выдатна было б, калі б мы, маладыя журналісты, крэатыўныя і смелыя, аб'ядноўвалі сілы, разам ажыццяўлялі сацыяльныя праекты і заклікалі праз свае сродкі масавай інфармацыі і іншых людзей не заставацца абыякавымі да чужых праблем.

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
22 09 2015 г.

#МаяБеларусь, #МойВыбар

# «КЛІК» ДА МОЛАДЗІ,

## або Размова на роўных



Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

**Паводле сацыялагічнага даследавання БРСМ, без мабільнага тэлефона свой звычайны дзень не ўяўляюць 98 працэнтаў апытаных юнакоў і дзяўчат, а большасць рэспандэнтаў бавяць у сецiве больш за тры гадзіны на дзень.**

Мы пагутарылі **са старшынёй Цэнтральнай кантрольнай камісіі гэтай маладзёжнай структуры, каардынатарам работы ў інтэрнэце Алесяй ВІННІК** і даведаліся пра тое, якую карысць можа прынесці сусветнае павуцінне нашай моладзі.

Праца ў інтэрнэт-прасторы была выбрана адным з ключавых кірункаў яшчэ шэсць гадоў таму, калі мы вызначалі для сябе стратэгію развіцця БРСМ. Сёння кожны малады чалавек зарэгістраваны ў сацыяльных сетках, атрымлівае інфармацыю з разнастайных інтэрнэт-парталаў, праглядвае форумы, выкарыстоўвае мабільныя праграмы... Наша задача была ў тым, каб стварыць маладзёжную беларускую інтэрнэт-прастору. І хто, як не моладзь, якая лічыцца найбольш актыўнай, мабільнай часткай грамадства, мусіць гэта рабіць?

Перш за ўсё мы абазначылі сябе ў сацыяльных сетках. Так склалася, што самая папулярная з іх у маладых беларусаў — «УКантакце». І на гэта мы зрабілі стаўку. Сёння там працуюць каля 350 суполак БРСМ, у якіх зарэгістраваны каля 300 тысяч чалавек. За гэтай лічбай хаваецца велізарнае поле для імгненнага распаўсюджвання інфармацыі! Атрымліваецца паспяхова працаваць з мікраблогамі сеткі Twitter. 173 акаўнты паведамляюць у рэжыме рэальнага часу аб падзеях і разнастайных мерапрыемствах. Прадстаўлены мы і ў іншых сетках — Facebook, «Аднакласніках», Instagram. Функцыянуюць суполкі і на хостынгу Youtube.com, у якіх перыядычна выкладваецца відэаінфармацыя. Мы актыўна і паўсюдна выкарыстоўваем хэштэгі — словы або фразы, якім папярэднічае сімвал #. Яны даюць магчымасць групаваць паведамленні на падобную тэматыку і з'яўляюцца найважнейшым інструментам пры пошуку і распаўсюджванні інфармацыі. Мы карыстаемся многімі хэштэгамі, сярод якіх *#БРСМ, #маяБеларусь, #мойВыбар, #маяБеларусь, #мойВыбор, #Belarus, #ялюблюбеларусь...* Моўная разнастайнасць неабходная для таго, каб нас чыталі не толькі ў Беларусі, але і ў іншых краінах свету.

Як пачувае сябе Саюз моладзі ў благасферы? Мушу зазначыць, што папулярнасць блогаў крыху знізілася. Але гэта адбываецца таму, што колькасць пераходзіць у якасць. Вядомых асоб у сферы культуры, спорту масава чытаюць па-ранейшаму. І ў нас ёсць шмат таленавітай моладзі, якая можа дзяліцца сваімі думкамі з усім грамадствам. Праз некалькі тыдняў з'явяцца блогі і на сайце brsm.by. Іх будуць весці нашы актывісты-мастакі. Пераможцы конкурсу «100 ідэй для Беларусі» раскажуць пра сферу інфармацыйных тэхналогій, актыў саюза ў яркай і даступнай манеры распавядзе пра тое, што сёння яны робяць для моладзі. Мы выкарыстоўваем пляцоўкі Livejournal, Blog.tut.by, Bloger.by. І самае галоўнае тут — не сфарміраваць культ асобы аўтара. Усё-такі людзі вераць таму, што пішуць у сацыяльных сетках, і не заўжды могуць адрозніць «качку» ад праўды.

Глабальная камп'ютарная сетка — гэта цудоўны спосаб расказаць пра сваю Радзіму, цікавыя мясціны сотням тысяч людзей і заадно спосаб самавызначэння. Напрыклад, Віцебская абласная арганізацыя праводзіла конкурс «Віцебшчына ў «Інстаграме». Яго ўдзельнікі дасылалі ў агульнадаступную суполку фотаздымкі прыгожых краявідаў, стварыўшы тым самым сапраўднае віртуальнае падарожжа. Гамяльчане прыдумалі цікавы праект «Свет праз інтэрнэт», які рэалізоўваўся сумесна з абласной пракуратурай. Хлопцы і дзяўчаты, якія стаяць на розных відах уліку, станавіліся своеасаблівымі назіральнікамі за парадкам. Яны фатаграфавалі мясціны, дзе былі не зачынены люкі, разбіты лесвічныя прыступкі, штосьці было паламана, і дасылалі гэтыя фотаздымкі на віртуальную дошку. Кантрольныя органы рэагавалі на іх і наводзілі парадак.

Але самым цікавым інтэрнэт-праектам стаў «Мая Беларусь — мой выбар». Ён быў запушчаны на пачатку года. Мы вырашылі ўсёй моладзі краіны расказаць пра тое, якія сацыяльна-эканамічныя пераўтварэнні, дасягненні ў галіне культуры, навукі, тэхналогій адбыліся ў нашай краіне. Адметнасцю праекта стала шырокае выкарыстанне інфаграфікі. Справа ў тым, што дзевяць з дзесяці людзей — візуалы. Яны лепш успрымаюць інфармацыю, калі яна падаецца не ў выглядзе тэксту, а як карцінка са звесткамі. Кожны рэгіён расказвае пра сваё жыццё, свае асаблівасці. І мы бачым, што наша задума ўдалася: выкладзеная намі інфармацыя актыўна распаўсюджваецца з дапамогай асабістых акаўнтаў карыстальнікаў.

Сацыяльныя сеткі і блогі — гэта толькі адзін з вялікіх кампанентаў нашай працы. Мы ўжо перайшлі на ўзровень праграмавання і ствараем свае навучальныя праграмы. Сайт «100 ідэй для Беларусі» — гэта таксама адна з нашых распрацовак». Нядаўна ў нас выйшла мабільная праграма — «MegaBook», дзе сабраны ўсе школьныя падручнікі з 5 па 11 класы. У любы момант можна адкрыць патрэбную кнігу і знайсці неабходную інфармацыю. Гэты праект узгоднены з Міністэрствам адукацыі. Займаюцца распрацоўкамі такіх цікавінак школьнікі старшых класаў і студэнты першых курсаў універсітэтаў.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**
*schklennik@zviazda.by*

Голас маладых

# СКАЖЫ МНЕ, ХТО ТВОЙ БЛОГЕР...

**Слова «тысячнік» (чалавек, які мае больш за тысячу падпісчыкаў на якой-небудзь з сацыяльных платформаў у інтэрнэце) даўно стала сінонімам паспяховасці. Мы запыталіся ў самых розных прадстаўнікоў моладзі, якія блогі яны чытаюць і як увогуле ставяцца да інфармацыі з сеціва.**

**Ягор КВАРТАЛЬНЫ, музыкант гурта «Нагуаль»:**

— Я чалавек, не надта ўцягнуты ў сацыяльныя сеткі. Карыстаюся «УКантакце» і Facebook, спецыяльна заходжу паглядзець на новыя посты літаральна ад некалькіх людзей, якія адначасова маюць што сказаць і ўмеюць выкладаць гэта прыгожа. Адзін такі мой прыяцель, напрыклад, жыве ў Аргенціне, размаўляе ці то на пяці, ці то на шасці мовах, па адукацыі гісторык і любіць падарожнічаць. Натуральна, у яго часам выходзяць ашаламляльныя замалёўкі пра месцы, людзей і падзеі, ад якіх немагчыма адарвацца.

**Іван ПРЫШЧЭПА, студэнт І курса спецыяльнасці «Лагістыка» Інстытута бізнесу і менеджменту тэхналогій БДУ:**

— Лічу гэтую з'яву добрай альтэрнатывай традыцыйным навінам у СМІ. Адзіная праблема — блогеры вельмі моцна ўплываюць на людзей, і не заўсёды гэты ўплыў станоўчы. З беларускіх аўтараў мне падабаюцца Антон Матолька і Іван Лятохін (абодва фатографы. — **Аўт.**). Першы, напрыклад, змагаецца з праблемай паркавак у Мінску, робіць карысную справу. Увогуле, галоўная карысць блогаў, на маю думку, заключаецца ў тым, што ты заўсёды можаш параўнаць свае думкі і светапогляд з іншым. Гэта дапамагае фарміраваць больш аб'ектыўную карціну свету.

**Валеры МАСКЕВІЧ, магістрант інжынерна-будаўнічага факультэта Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта:**

— Некаторыя смелыя думкі блогераў дапамагаюць бачыць нашу рэчаіснасць з самых розных бакоў. Я чытаю «фатографа-змагара з паркоўкамі» Антона Матольку, журналістаў Дзяніса Васількова і Віктара Малішэўскага, пісьменніка Віктара Марціновіча. Таксама падабаецца сачыць за актыўнымі ананімнымі блогерамі з розных гарадоў, каб здабываць інфармацыю пра культурнае і палітычнае жыццё ў рэгіёнах непасрэдна з першых вуснаў. У Facebook заходжу, каб палепшыць свае веды ў мастацтве, там таксама ёсць цікавыя аўтары. Унікальную і незвычайную інфармацыю пра гісторыю Беларусі чэрпаю з пастоў Глеба Лабадзенкі. Пра навінкі беларускай музыкі даведваюся ад Сяргея Будкіна. Як відаць, да блогераў я стаўлюся прыхільна, гэта дапамагае мне самаразвівацца.

**Дар'я БЕЛАНОЎСКАЯ, студэнтка ІІІ курса спецыяльнасці «электронны маркетынг» Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі:**

— Блогі выбіраю, зыходзячы са сваіх інтарэсаў: літаратура, кіно, спорт, танцы, мода, замежныя мовы, кулінарыя. Напрыклад, у Instagram сачу за дзяўчатамі, густ якіх у адзенні мне падабаецца. Іх фотаздымкі мяне натхняюць. На YouTube гляджу каналы пра фітнес і бодзібілдынг — вельмі матывуе. На каналах аб замежных мовах знаходжу падборкі цікавых выразаў, вытрымкі з серыялаў і фільмаў. У блогах аб кулінарыі — рэцэпты смачных страў, незвычайныя парады па кухні.

Сама вяду Instagram і Twitter — абнаўляю нячаста, проста захоўваю нататкі, якімі хочацца падзяліцца і якія хочацца пераглядаць. Таксама маю акаўнты на сайтах «Кинопоиск» і Livelib — зручна адзначаць тое, што ты паглядзеў або прачытаў.

**Уладзіслаў ТАТУР, каментатар Белтэлерадыёкампаніі:**

— Кожны мой дзень не абыходзіцца без Twitter. Думаю, гэта ідэальны рэсурс, асабліва для журналіста. Самы галоўны аспект маёй працы як тэлекаментатара — заўсёды быць у курсе апошніх навін, прычым не толькі спецыялізаваных, і інтэрнэт дазваляе гэта рабіць. У Twitter ёсць блогі вядучых сусветных спартыўных СМІ, інсайдарскіх крыніц, журналістаў, футбольных клубаў і саміх спартсменаў, з іх і складаецца мая стужка. Я люблю, калі людзі падыходзяць да вядзення мікраблога адказна і з фантазіяй, кожнае паведамленне суправаджаецца фотаздымкам, ёсць пэўны стыль. Заўважна, калі у аўтара ёсць пэўная канцэпцыя вядзення, яго твіты ты пазнаеш нават калі яшчэ не бачыш, хто іх напісаў.

**Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
*lyskavets@zviazda.by*

Сакрэты поспеху

# ДЗЁННІК У СЕЦІВЕ

## Сакрэты стварэння віртуальнага «нататніка»

**Штодня ў сеціве ствараюцца сотні тысяч новых блогаў. Толькі лічаныя працэнты з іх набіраюць пастаянную чытацкую аўдыторыю. Як жа правільна і паспяхова весці сваю старонку ў інтэрнэце?**

**Вызначцеся з дызайнам.** Калі сетка мікраблогаў Twitter прапаноўвае збольшага ўніверсальны дызайн, то пры стварэнні акаўнта на пляцоўцы LiveJournal ці Wordpress аб афармленні старонкі думаць давядзецца ўжо менавіта вам. Непажадана выкарыстоўваць значную колькасць гарнітур шрыфтоў і рабіць старонкі стракатымі.

**Праблема выбару.** Перш чым узяцца за вядзенне блога, падумайце, пра што вы будзеце пісаць: вучобу, фінансы, грамадскі транспарт, літаратуру, IT-навіны. Весці «ўніверсальны» блог не варта: усё азначае нічога. Лепш выбраць тэму, якая з'яўляецца вашым каньком, але разам з тым трэба прааналізаваць сітуацыю, каб не паўтарыць тое, што напісана іншымі.

**Запаўняць блог трэба рэгулярна.** Рабіць гэта пажадана або штодня, або праз дзень. Весці яго «пад настрой» памылкова: не выключана, што з доўгімі перапынкамі чытачы знікнуць.

**Ваша візітоўка.** Інтэрнэт-загалоўкі адрозніваюцца ад газетных тым, што яны заўжды прадстаўлены ў форме сказа і мусяць змяшчаць дзеяслоў. Робіцца гэта для таго, каб заінтрыгаваць чытача блога ўжо на тым этапе, калі ён толькі зайшоў у вашу віртуальную гасцёўню. Разам з тым не трэба перабольшваць: загаловак не павінен раскрываць увесь змест матэрыялу, а толькі намякаць на яго. Памер загалоўка, які задаецца спецыяльнымі тэгамі, уплывае на індэксацыю яго пошукавымі сістэмамі.

**Будзьце дасціпныя.** Сусветныя тэндэнцыі карыстання інтэрнэтам усё больш схіляюцца ў бок мабільных прылад. Прачытаць удумліва на экране смартфона велізарны пост на дзясятак старонак, што можа заняць не адну гадзіну, не здатны ніхто. Не так даўно пад такімі тэкстамі з'яўляліся каментары кшталту «шмат літар» ці «не асіліў». Сёння інфармацыя павінна выкладацца ёмка, цікава і коратка. Памятайце пра ключавыя словы: гэта запыты, якія карыстальнікі задаюць пошукавым сістэмам. Праверыць частату і геаграфію іх ужывання можна з дапамогай сэрвісу wordstat.yandex.ru ці Google Adwords. Калі вы іх задасце правільна, то вас будуць знаходзіць праз пошукавік.

— Адзін з найважнейшых элементаў прасоўвання інфармацыі ў блогу — яе рэпост іншымі карыстальнікамі, — гаворыць **блогер Аляксей БЯРЭЗІН.** — Калі вы выкладаеце каштоўную інфармацыю, вельмі хутка заўважыце, што ваш блог не толькі чытаюць, а яшчэ і дзеляцца яго зместам з іншымі. А гэта вам толькі на руку — пра вашу пляцоўку даведаецца яшчэ больш людзей. Існуе, праўда, праблема аўтарскіх правоў — не заўжды пры запазычанні матэрыялу прастаўляюцца спасылкі на першакрыніцу. Таму перыядычна маніторце, як рэпосцяцца вашы тэксты: пошукавыя сістэмы памятаюць усё. Аптымальная колькасць тэксту для аднаго поста лічыцца ў межах 3 тысяч знакаў. Што да літаратуры, то ў інтэрнэце найбольшай папулярнасцю карыстаюцца або навуковыя, або гумарыстычныя тэксты.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**
*schklennik@zviazda.by*

*Шорт-ліст*

# АД ЖУРНАЛІСТЫКІ ДА ЛІТАРАТУРЫ — АДЗІН КРОК...

## ...праз браму мар

**Журфак БДУ заўсёды быў тым месцам, дзе пачыналі свой творчы шлях не толькі будучыя «акулы пяра», але і пісьменнікі: Генадзь Бураўкін, Пятро Васючэнка, Анатоль Вярцінскі, Леанід Дайнека, Барыс Сачанка, Янка Сіпакоў — гэты спіс можна падаўжаць, здаецца, бясконца. У Інстытуце журналістыкі БДУ і цяпер не забываюцца на сваю цесную сувязь з літаратурай — новых «зорак» тут ужо пяць гадоў шукаюць на конкурсе «БрамаМар», дзе з першапачаткоўцамі працуюць прызнаныя майстры. Пра тое, чым апошні адрозніваўся ад папярэдніх, куды вядуць шляхі новай беларускай літаратуры і якія праблемы турбуюць сучасную творчую моладзь, расказаў адзін з арганізатараў, дацэнт кафедры літаратурна-мастацкай крытыкі Інстытута журналістыкі БДУ Уладзімір КАПЦАЎ.**

### СТАЎКА НА САМЫХ ЮНЫХ

— Штогод у арганізацыі конкурсу нешта мяняецца. Мы адэкватна глядзім на свае магчымасці, адпаведна выбіраем і фармат для «БрамаМар». Сёлета вось вырашылі больш актыўна прыцягваць школьнікаў. У нас і раней была асобная намінацыя для юных аўтараў— «БрамаМар-юні», але ў гэтым годзе яе ўдзельнікі фактычна выйшлі на першы план — як па колькасці твораў, так і па іх якасці. Такая своеасаблівая «хвіліна славы» для школьнікаў.

Самая вялікая арганізацыйная праблема — данясенне інфармацыі да ўдзельнікаў. Для мяне дзіўна, што ў сучасным тэхнічна развітым грамадстве ўзнікае такое пытанне. Нярэдка даводзіцца чуць ад студэнтаў, што яны банальна не ведалі аб правядзенні конкурсу. Аналагічная праблема ўзнікае і са школамі — многія проста не адгукаюцца на нашы запрашэнні. Тым не менш яркіх і таленавітых школьнікаў хапае.

Яшчэ адзін наш сёлетні эксперымент — вызначэнне пераможцаў. Раней тэксты дасылаліся загадзя, мы фарміравалі шорт-ліст, потым праводзілі другі тур з агульнымі творчымі заданнямі для фіналістаў, па выніках якога журы вызначала пераможцаў. Цяпер жа прапанавалі пісьменнікам, якія праводзілі майстар-класы для ўдзельнікаў, прыдумаць свае творчыя заданні. Моладзь іх выконвала, а пераможцу выбіралі, так бы мовіць, на месцы па выніках працы. Можа быць, гэта дадало суб'ектывізму, бо кожнаму патрэбен розны час на тое, каб напісаць штосьці годнае... Але адначасова вырас і ўзровень «драйву», а гэта вельмі важна. Вось у такім спалучэнні амаль спартыўнай канкурэнцыі і літаратуры, як мне падаецца, маладым аўтарам было цікава працаваць.

Калі казаць пра саміх удзельнікаў, дык сфарміраваць нейкі зборны партрэт цяжка. Вядома, больш за ўсё да нас прыходзіць студэнтаў-філолагаў, але і «фізікі» не з'яўляюцца рэдкім выключэннем. Напрыклад, на самым першым конкурсе ў намінацыі «Паэзія» пераможцам стаў хлопец з фізіка-матэматычнага факультэта БДУ. Усё вызначае талент. У той жа час мы, так бы мовіць, «вярбуем» на журфак школьнікаў: сёлета сем удзельнікаў «БрамаМар» сталі студэнтамі нашага факультэта.

### ЛЮСТЭРКА «ДАРОСЛАЙ» ЛІТАРАТУРЫ

— Мы традыцыйна не маем праблем з работамі ў намінацыях «Проза» і «Паэзія» — яны заўсёды карыстаюцца папулярнасцю. Затое здараюцца неспадзяванкі ў іншых «франтах», і гэта адлюстроўвае нашу агульную карціну ў літаратуры.

Узяць, напрыклад, драматургію. Штогод сутыкаемся з тым, што драматычныя творы — гэта адзінкавы тавар на літаратурным рынку. Пятро Васючэнка, які некалькі разоў быў членам нашага журы, кажа, што драматургам можна стаць толькі пасля 40 гадоў. І я разумею, што ён хоча сказаць, — драматургія ці эпічная проза патрабуюць ад аўтара пэўнага жыццёвага досведу. Паэтам можна нарадзіцца на свет і рэалізавацца амаль у любым узросце, узгадаем тую ж Віку Трэнас. Такім чынам, я пагаджаюся са спадаром Васючэнкам, але ад намінацыі мы не адмаўляемся, каб не страцілі свой шанц тыя, у каго ёсць задаткі.

**«Разуменне многіх жыццёвых з'яў у маладых аўтараў бывае максімалісцкім ці занадта спрошчаным. Яны пакуль не бачаць, што некаторыя рэчы складанейшыя, чым яны здаюцца на першы погляд».**

Велізарная праблема і з крытыкай — пэўна, нават большая, чым з драматургіяй. І гэта таксама адлюстроўвае агульны стан — у нас зусім мала сапраўды таленавітых крытыкаў у розных сферах, калі весці размову не пра старэйшае пакаленне, а пра больш маладых. Бо крытык павінен валодаць такім жа талентам, як і пісьменнік. Мы таксама прынцыпова працягваем праводзіць конкурс і па гэтай намінацыі. Сёлета цалкам сканцэнтраваліся на кінакрытыцы і не прагадалі. На другім курсе спецыяльнасці «вэб-журналістыка» знайшліся зацікаўленыя ў гэтым студэнты, яны даслалі з дзясятак работ і «піярылі» намінацыю на сваім сайце. Іх прачыталі прафесіяналы — галоўны рэдактар часопіса «На экранах» Людміла Перагудава, загадчыца нашай кафедры кінакрытык Людміла Саянкова. Пасля гэтага адбыліся і персанальныя размовы паміж імі. Студэнты зразумелі, што яны нешта могуць не толькі ў вэб-журналістыцы, але і ў крытыцы, і калі ўсё будзе ісці як след, яны знойдуць сябе ў гэтай творчай галіне. Калі так здарыцца, я палічу, што конкурс сёлета сваю задачу выканаў. Дарэчы, менавіта ўвядзенне моладзі ў пэўную літаратурную «тусоўку» я лічу адной з галоўных задач «БрамаМар».



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА

**Уладзімір Капцаў са студэнткамі трэцяга курса Інстытута журналістыкі БДУ Надзеяй Краўчук і Мар'яй Янковіч, якія будуць арганізоўваць конкурс «БрамаМар» у наступным годзе.**

Калі размаўляць пра тэматычнае кола, то тут трэба адзначыць галоўнае — удзельнікі пішуць пра ўсё. У іх творах закранаюцца ўсе без выключэння традыцыйныя тэмы. Хутчэй за ўсё, гэта абумоўлена ўзростам. Маладосць — час, калі цябе цікавіць увесь свет, ты не абмяжоўваешся адной ці некалькімі сферамі. З іншага боку, разуменне многіх жыццёвых з'яў у маладых аўтараў бывае максімалісцкім ці занадта спрошчаным. Яны пакуль не бачаць, што некаторыя рэчы складанейшыя, чым яны здаюцца на першы погляд.

Мы неяк спрабавалі спецыяльна задаць адну тэматыку — ваенную, — але не магу сказаць, што атрымалася добра. Было мала «жывых» тэкстаў. І ў гэтым ёсць свая праўда жыцця, бо паэзія таксама грунтуецца на перажытым. А пакаленне тых, хто бачыў вайну, паступова адыходзіць. Моладзь усё менш чуе пра тыя падзеі з першых вуснаў і гэта скажае ўспрыманне.

### НА ЯКОЙ МОВЕ ПІСАЦЬ?

— Моўнае пытанне вельмі няпростае. Умова, якую нам ставяць спецыялізаваныя выданні, — «мы надрукуем толькі па-беларуску». Прозу моцных маладых аўтараў могуць перакласці, праўда, не ўсе разумеюць, колькі нюансаў аўтарскага стылю пры гэтым страчваецца. Мы імкнёмся, каб конкурс быў максімальна раўнапраўным і адкрытым для ўсіх, але атрымліваецца, што ў беларускамоўных аўтараў ёсць прыярытэт.

З іншага боку, самі разумеем, што беларускае трэба падтрымліваць, таму праводзім свае вечарыны на мове. Некалі нават жартавалі, што графаманам прасцей быць, калі пішаш па-руску, чым калі па-беларуску. Але не трэба адыходзіць ад рэальнасці — пераважная большасць моладзі размаўляе па-руску, гэтая мова стала для іх роднай. Калі чалавек піша на рускай мове і робіць гэта таленавіта, то навошта яму замінаць? Магчыма, падтрымка стане для яго прыступкай ва ўсведамленні таго, што беларускі пісьменнік павінен пісаць толькі па-беларуску, асабліва што датычыцца празаікаў. Не трэба разбураць усё ў самым пачатку: «Пішаш па-руску? Ну і пішы сам для сябе».

Калі паэт з Магілёва Дзмітрый Дзмітрыеў адным радком змог перадаць усю гісторыю мінулага стагоддзя, але зрабіў гэта па-руску, гэта не змяншае яго геніяльнасці: «Арийская спичка, сгорев безвозвратно, обнаружит в себе чернокожего брата». Дарэчы, цяпер ён піша і па-беларуску, што толькі пацвярджае маю папярэднюю думку.

Добра, што «БрамаМар» не становіцца зусім «камерным» конкурсам, хоць у самым пачатку і была прапанова праводзіць яго выключна для журфакаўскіх студэнтаў. У нас шырокая геаграфія, вялікая колькасць удзельнікаў... Дарэчы, ёсць нават маленькая традыцыя: фіналісты-журфакаўцы вяртаюцца да нас ужо ў якасці арганізатараў.

*Усё ў тваіх руках*

# ХІМІЯ ТАЛЕНТУ,

## або Ад шпаргалкі да «Выбараў»




**За апошні год жыццё пераможцы конкурсу «100 ідэй для Беларусі» Паўла БАЦЫЛЕВА істотна змянілася: хлопца ўзялі працаваць у цэнтр інтэрнэт-праектаў Беларускага рэспубліканскага саюза моладзі, яго рукамі быў створаны дадатак «У саюз з сябрамі», а зусім нядаўна выйшла новая праграма — «Выбары-2015». Пры гэтым юнак стаў ужо другакурснікам механіка-матэматычнага факультэта БДУ. Павел распавёў нашаму карэспандэнту пра тое, як праграмаванне змяняе яго жыццё, якія перспектывы ён для сябе бачыць і чым займаецца цяпер.**

***— Як ствараласяя чарговая праграма «Выбары-2015»?***

— Не скажу, што гэта была выключна мая ідэя — праект задумваўся супольна пры ўдзеле БРСМ і інфармацыйнага агенцтва БелТА. Распрацоўка пачалася ў канцы ліпеня. У гэтым і была галоўная цяжкасць: вельмі сціслыя тэрміны для прадукту, які павінен працаваць адразу на двух платформах: iOS і Android. Больш за тое, была задача зрабіць праграму, інфармацыя ў якую загружалася б без абнаўлення, як бы сама па сабе. Карыстальніку не трэба нешта націскаць, усе змены адбываюцца літаральна на яго вачах. Напрыклад, яшчэ ўчора вы адкрывалі праграму, і вынікаў галасавання не было, а сёння ўжо з'явіліся. А яшчэ, нават калі ў вас няма доступу да інтэрнэту, інфармацыя, якая была запампавана раней, застаецца. Таму з тэхнічнага боку праца была даволі складаная.

З пэўнай часткай мне дапамог сябра Антон Філіповіч, з якім мы вучымся на механіка-матэматычным факультэце. Дарэчы, ён жа дапамагаў ствараць і «У саюз з сябрамі».

***— Наколькі ведаю, ты актыўна шукаў інвестараў для свайго першага праекта — праграмы для рашэння задач «Хімія Х10», з якім перамог на «100 ідэй для Беларусі»?***

— Ён застаецца самым паспяховым з усіх маіх праектаў. Так, я сапраўды шукаў інвестара, які зацікавіўся б праграмай як бізнес-праектам. Наведваў шматлікія стартап-мерапрыемствы, размаўляў з людзьмі, якія ўжо нечага дасягнулі... На жаль, так і не атрымалася даказаць ім мэтазгоднасць працы, хоць, думаю, быў блізкі да гэтага. Можа, мой узрост паўплываў... Тым не менш праект працягвае развівацца. Цяпер колькасць запамповак праграмы на Android па СНД ужо перавысіла 140 тысяч, прытым што летам праграмы для школы звычайна загружаюць вельмі мала. Ды і сярэдняя адзнака, якую выстаўляюць карыстальнікі, з выпускам новай, больш пашыранай версіі вырасла яшчэ на адну дзясятую і цяпер складае 4,3. Гэта добры плюс, ён матывуе далей працаваць над «Хіміяй Х10», каб зрабіць з яе штосьці больш якаснае. У блізкіх планах — запусціць праграму на іншых, акрамя СНД, рынках і пачаць атрымліваць прыбытак, з інвестыцыямі або без іх. А ідэі, чаго туды яшчэ карыснага дадаць, ёсць, і шмат. Увогуле, цяпер я збіраюся накіраваць больш высілкаў менавіта ў гэтым кірунку.

***— Чым ты яшчэ займаўся апошнім часам?***

— Летам рабіў мабільную праграму для газеты «СБ. Беларусь сегодня». Задача таксама была не з простых — яна павінна была мець шырокі функцыянал. Карыстальнік можа праглядаць сам нумар газеты, чытаць навіны па рубрыках і шмат іншага. Акрамя таго, у праграме можна пазнаёміцца з матэрыяламі іншых выданняў аднайменнага медыяхолдынга. Яна ўжо ёсць у Google Play, цяпер распрацоўваю версію для AppStore.

***— Ты студэнт механіка-матэматычнага факультэта БДУ. Не шкадуеш пра свой выбар?***

— Ні ў якім разе. За першы курс я паспеў улюбіцца ў факультэт, цяпер заўсёды раю яго шматлікім знаёмым абітурыентам. Моцна пасябраваў з хлопцамі з групы, з некаторымі сустракаліся летам. У плане вучобы пытанняў таксама няма, нават на першым курсе было шмат цікавых профільных дысцыплін, дзякуючы якім я даведаўся шмат новага. Многае цяпер выкарыстоўваю ў сваіх праектах.

***— Якія ў цябе планы на будучыню?***

— Хачу больш развівацца ў кірунку маркетынгу. Гэта не значыць, што я страцію цікавасць да праграмавання, не. Але прасоўванне прадукту — не менш важная частка, чым яго стварэнне, і мне хочацца ўдасканаліцца ў гэтым.

**Матэрыялы паласы падрыхтаваў Яраслаў ЛЫСКАВЕЦ.**
*lyskavets@zviazda.by*

ЧЫРВОНКА
Чырвоная змена
22 09 2015 г.

За кадрам

# ТБ-ПРАГРАМЫ АД ПРАГРАМІСТАЎ



## Як працуюць тэлевізійнікі галоўнага IT-універсітэта краіны? З гумарам!

**Гісторыя маладзёжнага тэлебачання БДУІР налічвае амаль 15 гадоў. За гэты час яно паспела зарэкамендаваць сябе як адно з найлепшых сярод студэнцкіх. Відэа, падрыхтаваныя будучымі праграмістамі, два гады перамагалі на конкурсе «Студэнт года». А ў сецыве ролікі збіраюць тысячы праглядаў. Карацей, ёсць чаму павучыцца. Мы завіталі на тэлебачанне БДУІР і даведаліся, як зрабіць навіны, цікавыя моладзі; што трэба, каб ператварыць калідор у фотастудыю, і навошта ТБ-каманда айцішнікаў бярэ з сабой на здымкі пластыкавыя трубы.**

### Пра матрыцы — з 25-га дубля

Асновы журналістыкі тэхнары на парах не вывучаюць, але працуюць амаль як прафесійныя тэлевізійнікі. Навіны стараюцца выпускаць у той жа дзень, калі знялі, максімум — на заўтра зранку. За тыдзень, у залежнасці ад насычанасці ўніверсітэцкага жыцця, выходзіць ад трох да дзесяці сюжэтаў. У ТБ-камандзе пяць карэспандэнтаў, шэсць мантажораў-аператараў, чатыры фатографы. Хоць многія могуць і ў стэндапе зняцца, і ролік зманціраваць. Вядома, не адразу ўсё атрымліваецца. **Студэнтка Ганна ЛОСЬ**, кіраўнік піраддзела, памятае, як упершыню здымалася ў стэндапе: «Мне трэба было сказаць: «матрыцы звыш'яркіх святлодыёдаў на алюмініевых анадзіраваных платах для святлотэхнічных прылад». Вы ўяўляеце, першы раз працую на камеру і тут такое! Мы перазапісвалі гэты момант разоў 25».

Акрамя навінавых сюжэтаў, студэнты здымаюць яшчэ і творчыя ролікі. Напрыклад, штогод рыхтуюць рэкламу для сваёй ВНУ.

— Летась, я ведаю, піяршчыкі ацанілі нашу рэкламу не надта высока, — дзеліцца **прэс-сакратар БДУІР Алена САКАЛОЎСКАЯ**. — Параілі нам не ісці ў гумар, зрабіць больш класічны варыянт. Сёлета мы ўлічылі гэтыя заўвагі.

Свае відэа студэнты не толькі круцяць у вучэбных карпусах, але і выкладваюць на YouTube. Найбольш папулярнымі становяцца ролікі па ўступнай кампаніі. Сёлетні сабраў восем тысяч праглядаў! На думку Ганны, каб прыцягнуць увагу да матэрыялу, трэба падабраць правільнае суправаджэнне:

— Дзесьці неабходна пасупрацоўнічаць са СМІ, дзесьці дастаткова выкласці відэа ў суполку «УКантакце» з цікавым подпісам. Цяпер мы актыўна прасоўваем студэнцкае тэлебачанне праз сацыяльныя сеткі. Сёння ў суполцы амаль 1,5 тысячы падпісчыкаў.

### Усё дзеля прыгожай «карцінкі»!

На тэхніку журналістам-айцішнікам скардзіцца не прыходзіцца. У іх распараджэнні тэлесуфлёр, мікрафоны з фірменнай ветраабаронай, HD-камеры і... аператарская каляска. Апошнюю самі змайстравалі. Набылі пластыкавыя трубы, якія замяняюць рэйкі, зрабілі трохкутнік (на ім мацуецца камера) і прыладзілі колцы ад скейтборда. Бяруць цяпер гэтую каляску ледзь не на ўсе здымкі. Смяюцца, што гледачы, можа, плаўны праезд і не бачаць, але самой ТБ-камандзе гэтая дэталь здаецца вельмі заўважнай. Увогуле, каб зрабіць у кадры прыгожую «карцінку», студэнты выкарыстоўваюць усе падручныя сродкі. Напрыклад, пераварочваюць стэнды, калі тэрмінова патрэбен белы фон. Не хапае сваёй тэрыторыі — едуць запісваць відэа ў офісы IT-кампаній. Ці ствараюць студыю з дапамогай камп'ютарнай графікі або ў калідоры ўніверсітэта: завешваюць вокны коўдрамі і расстаўляюць студэнтаў з асвятляльнымі прыборамі ў руках.



Навіны, рэкламныя ролікі, пазнавальныя праграмы — тэлекаманда БДУІР можа зрабіць усё.

На маладзёжным тэлебачанні ёсць нават свой візажыст. Алена Сакалоўская з усмешкай узгадвае, як яны першы раз рабілі макіяж дзяўчыне для здымак: «Я дагэтуль не запісвала чалавека без грыму на відэакамеру, толькі фатаграфавала. А на фота святло «з'ядае» макіяж. Таму мы нанеслі касметыку максімальна. Заводзім героя ў аўдыторыю і бачым, што на нас усе са здзіўленнем азіраюцца. «Вы яе часам не перафарбавалі?» — спытаў у мяне адзін з хлопцаў. Але я была ўпэўнена, што для відэа — гэта «самае тое». Потым, калі глядзелі ролік, вядома, убачылі сваю памылку: дзяўчына з яркім вячэрнім макіяжам вельмі вылучалася сярод астатніх студэнтаў у кадры».

З грашыма на здымачны працэс дапамагае ўніверсітэт. Але каманда задумваецца над тым, каб самім прыцягваць сродкі. Варыянт БДУ — здаваць студыю буйным ТБ-каналам у арэнду — тут не падыходзіць. Студыі няма. Затое можна паспрабаваць арганізоўваць платныя курсы па тэлевізійным майстэрстве.

### «Зачапіць» гледача і... кадры

Цяпер на маладзёжным тэлебачанні БДУІР распачаўся рэбрэндзінг: вырашылі змяніць лагатып і застаўкі навін. Прэс-сакратар універсітэта кажа, што яны хочуць адрозніваццa ад іншых:

— Мы шукаем свой стыль. І ўсё роўна, што нашы застаўкі не будуць адпавядаць класічнаму ўяўленню аб тым, як яны павінны выглядаць.

Стандартныя выпускі навін студэнты «разбаўляюць» цікавымі праектамі. Адзін з іх — праграма «Падслухана» (відэаверсія папулярнай аднайменнай суполкі «УКантакце»). Вядучы прымерыць на сябе вобраз тыповага савецкага школьніка — «вадалазку» і акуляры — і ў іранічнай форме будзе расказваць пра падзеі, якія найбольш актыўна абмяркоўваюцца ў студэнцкім асяродку. «Навіны ў дзелавым стылі не заўсёды ўспрымаюцца моладдзю, таму мы дададзім гумару. Думаем яшчэ рабіць агляд фільмаў: куды варта схадзіць, а на што лепш не марнаваць час. Ацэнка будзе катэгарычнай, бо такі падыход «чапляе», — тлумачыць Алена.

У планах таксама запусціць праграму пра выхад з крызісных сітуацый. І спецыялізаваныя IT-навіны: ніша не запоўнена. Парк высокіх тэхналогій, напрыклад, ужо прапаноўваў студэнтам здымаць тэматычныя сюжэты.

— Да нас на тэлебачанне прыходзяць творчыя і тэхнічна падкаваныя людзі, — хваліць сваю каманду Алена Сакалоўская. — З імі лёгка працаваць. Ёсць, вядома, праблема з напісаннем тэкстаў, але што тычыцца мантажу, графікі — вельмі хутка асвойваюць. Ты на словах тлумачыш, што хочаш убачыць, а яны ўжо ведаюць, як гэта рэалізаваць тэхнічна. Таму студэнтаў БДУІР ахвотна бяруць на тэлеканалы. Але мне б хацелася стварыць тут прафесійную платформу, каб нашы хлопцы і дзяўчаты, якія вырашылі займацца журналістыкай, заставаліся ва ўніверсітэце. Цяпер на працу ў прэсслужбу БДУІР прымаюць ахвотных з факультэта журналістыкі. Мне здаецца, нашы студэнты, якія ўжо праявілі сябе на тэлебачанні падчас навучання, таксама гэтага вартыя.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*

Праца на імідж

# МЕДЫЯЦЭНТР — ГІД І НАВІГАТАР БДУ

**По звестках міжнародных рэйтынгавых агенцтваў, БДУ ўваходзіць у два працэнты найлепшых універсітэтаў свету, займаючы высокія пазіцыі сярод 30 тысяч ВНУ. Такі паказчык — вынік шматгадовай працы як супрацоўнікаў, так і студэнтаў. Акрамя гэтага, імідж аднаго з галоўных універсітэтаў краіны фарміруюць яго актыўнасць, інфарматыўнасць і адкрытасць у дачыненні да сваёй аўдыторыі. З гэтымі задачамі апошнія паўтара года добра спраўляецца медыяцэнтр БДУ, аб дзейнасці, функцыях і праектах якога «Чырвонцы. Чырвонай змене» расказаў яго начальнік Павел САЛАЎЁЎ.**

— Ва ўніверсітэце наспела неабходнасць аб'яднаць структуры, якія выконвалі б розныя, але ў той жа час аднолькавыя функцыі. Быў неабходны адзіны «штаб», які займаўся б распрацоўкай і рэалізацыяй канкрэтных праграм, скіраваных на фарміраванне станоўчага іміджу ўніверсітэта ў якасці адукацыйнага, навуковага, даследчага цэнтра сусветнага ўзроўню, вядучай вышэйшай навучальнай установы ў Беларусі. Нам было неабходна забяспечыць інфармацыйную прысутнасць БДУ ў сродках масавай інфармацыі. Рэгуляванне ўнутраных і знешніх інфармацыйных плыняў ва ўніверсітэце таксама павінна была ўзяць на сябе новая структура.

***— Як удаецца спраўляцца з такой колькасцю задач?***

— Медыяцэнтр складаецца з трох аддзелаў: прэс-службы ўніверсітэта, аддзела ўнутрыўніверсітэцкіх камунікацый і аддзела вэб-праектаў і стратэгічных камунікацый. Менавіта такі падзел дазваляе нам усё паспяваць. Прэс-служба, напрыклад, збірае інфармацыю са структурных падраздзяленняў, якія арганізоўваюць то ці іншае мерапрыемства. Далей гэтыя звесткі рассылаюцца па сродках масавай інфармацыі, становяцца матэрыялам для сайта БДУ.

На выпуску газеты «Універсітэт» зараз засяроджаны аддзел унутрыўніверсітэцкіх камунікацый. Ён жа займаецца і напаўненнем сайта газеты. Зусім нядаўна мы зрабілі яго рэдызайн, каб карыстанне было больш зручным, а знешні выгляд — прэзентабельным. Варта адзначыць, што сайт газеты «Універсітэт» не з'яўляецца поўным адпаведнікам друкаванага выдання. На сайце ёсць магчымасць рабіць кросмедыйныя, мультымедыйныя публікацыі, і мы актыўна гэтым карыстаемся.

Аддзел вэб-праектаў і стратэгічных камунікацый займаецца спецпраектамі, накіраванымі на прасоўванне іміджу БДУ ў сусветнай інфармацыйнай прасторы, а таксама падтрымкай акаўнтаў універсітэта ў сацыяльных сетках. Сёння БДУ прысутнічае ва ўсіх сацсетках, дзе ёсць нашы студэнты. Напрыклад, група Белдзяржуніверсітэта «УКантакце» зараз налічвае 20 тысяч чалавек. Разлічваем, што ў хуткім часе нас стане яшчэ больш — далучацца першакурснікі. Facebook мы вядзём на рускай, беларускай мовах і асобна — на англійскай (акаўнт на ёй запатрабаваны ў міжнародных партнёраў).

На YouTube ў Белдзяржуніверсітэта ёсць уласны канал з велізарнай колькасцю відэа. Шмат яго рубрык прысвечаны дзейнасці БДУ, абітурыентам, кароткім апытанням накшталт «Як вы правялі лета?» або «На якой спецыяльнасці навучаешся?». Такія ролікі карыстаюцца вялікай папулярнасцю сярод студэнтаў.

***— Відэаролік «Study in Belarus», які прапагандуе навучанне ў Беларусі, сабраў больш за 11 тысяч праглядаў. Якімі яшчэ відэапраектамі ганарыцца медыяцэнтр БДУ?***

— Год назад знялі ролік «Супраць спайсаў», дзе ў мастацкай манеры з запрашэннем каманды па амерыканскім футболе «Litwins Minsk», групы падтрымкі «DanStart» БДУ, а таксама нашых студэнтаў мы паспрабавалі сказаць, што курыльныя сумесі — гэта не тое, на што варта марнаваць сваё жыццё. Відэа набрала больш за 15 тысяч праглядаў, што для сацыяльнага роліка — вельмі добры вынік. Наконт эфектыўнасці такіх відэа я магу адказаць так: калі наш ролік спыніў ад ужывання спайсу нават аднаго чалавека — яго варта было рабіць. Такія відэаролікі звычайна здымаюцца без бюджэту, гэта ўласная ініцыятыва супрацоўнікаў БДУ і студэнтаў.

***— Напярэдадні сёлетняй уступнай кампаніі медыяцэнтрам БДУ быў створаны асобны сайт для абітурыентаў...***



Калектыў медыяцэнтра БДУ.

— Нам здаецца, што сайт — удалы прыклад камунікацыі з канкрэтнай мэтавай аўдыторыяй. Гэта магчымасць для абітурыентаў хутка атрымаць патрэбную інфармацыю ў зручнай форме. Сайт адаптаваны пад прагляд на любых прыладах: гэта можа быць манітор і камп'ютара, і планшэта, і смартфона. Сайт «Абітурыент БДУ» атрымаўся настолькі карысным і зручным, што нам далі за яго галоўную ўзнагароду ў катэгорыі «Адукацыя» інтэрнэт-прэміі ТИВО-2015. Гэта, напэўна, і ёсць найлепшае пацвярджэнне таго, што мы ведаем патрэбы і густы сваёй аўдыторыі. Вельмі важныя для нас водгукі, рэтвіты, рэпосты студэнтаў і вялікая колькасць праглядаў.

***— Павел Леанідавіч, медыяцэнтр універсітэта нельга ўявіць без студэнтаў. Ці прыцягваеце іх да працы?***

— Абавязкова, часцей, праўда, на пазаштатных умовах. Шмат студэнтаў БДУ прыходзіць да нас на практыку. Тым не менш рабіць пасапраўднаму якасны прадукт павінны прафесіяналы з адпаведнымі ведамі і адукацыяй. Таму дзверы медыяцэнтра для тых маладых спецыялістаў, хто сапраўды хоча працаваць на карысць роднага ўніверсітэта, заўсёды адчынены. Што датычыцца студэнтаў, то яны актыўна публікуюцца ва ўніверсітэцкай газеце, удзельнічаюць у здымках відэаролікаў і распрацоўцы цікавых праектаў.

***— Якія творчыя планы на гэты навучальны год?***

— Да першага верасня мы запусцілі спецпраект «Гід першакурсніка», каб дапамагчы ўчарашнім школьнікам прыстасавацца да «новага жыцця» ва ўніверсітэце. Сайт патрабуе раскруткі і ўдасканалення. Імідж універсітэта вымагае і выдатнай візуальнай падтрымкі. Зараз мы вядзём актыўную распрацоўку брэндбука БДУ. Гэта будуць рэкамендацыі па выкарыстанні фірменнага стылю Белдзяржуніверсітэта. У брэндбуку будзе сабрана ўся сімволіка ўніверсітэта, застаўкі на маніторы, візіткі супрацоўнікаў і сувенірная прадукцыя.

**Кацярына АСМЫКОВІЧ.**

Друкуецца ў «Маладосці»

Аляксандр ТЭМЛЕЙН

# ДЖАСПЕР & ЭМІЛІ

**Ён і творы свае называе заўсёды двума словамі праз гэты злучнік — «Джаспер & Эмілі», «Трубакладчык & Сцяна», «Горад & Маска», — і сам на такі ж манер прадстаўляецца: Аляксандр Змушка & Саша Тэмлейн. Першы — кандыдат біялагічных навук, навуковы супрацоўнік аддзела біятэхналогіі Інстытута пладаводства, другі — пісьменнік, які працуе ў жанрах навуковай фантастыкі, прыгодніцкага, філасофскага і гумарыстычнага фэнтэзі, альтэрнатыўнай гісторыі і дзіцячай казкі.**



Джаспер быў дрэвам.

Ён усё папярэдняе жыццё марыў абярнуцца дрэвам, і вось у яго атрымалася. Джаспер спакойна рос, магутна распасцёршыся над абрывам; яшчэ крыху — і яго карэнне паласкалася б у аблоках і хмарах. У яго зялёнай галаве звіла гняздо нейкая птушачка, але, паколькі ў папярэднім жыцці ў заалогіі ён асабліва не разбіраўся, то не ведаў, што за яна. Але птушачка так смешна вымаўляла раніцай «Пень! Пень!», што Джасперу адразу ж прыйшлася даспадобы. Лістоты ў яго не было — адны толькі трывалыя шыпулькі, а ствол ён меў звонку і залацісты, як і належыць усялякай добрасумленнай сасне.

Джаспер быў сваім жыццём больш чым задаволены.

Тут ніколі не было суха, а глебы хапала, каб учапіцца вузлаватымі каранямі.

Высока-высока ўгары чорнымі кропкамі лунаслі птушкі, зрэдку прабягаў горны баран, а ўнізе, пад абрывам, праз жмуты аблокаў віднеўся Горад: маленькі, такі ўтульны і прыгожы, быццам быў выбудаваны з карамелі і зацвярдзелай нугі. Джаспер памятаў, што калісьці ён жыў у ім, але там было занадта шумна, вечна патрабавалася размаўляць і нешта вырашаць, а ён гэтага не любіў.

Тут Джаспер таксама зрэдку гутарыў: калі вецер, які жыве высока ў пячоры на схіле гары, разыходзіўся не на жарт, то хвоі рыпелі і стагналі — скардзіліся адна адной на жыццё, а то і дзяліліся плёткамі або фантазіямі пра тое, што нядрэнна б ім было стаць карабельным лесам, трапіць у лапы лесніка з сякерай, стаць выдатнай стройнай мачтай і пабачыць чужыя краіны.

Джаспер ні пра што гэтакае не марыў.

Ствол яго быў зламаны дзесяць разоў, галіны раскінуліся шырока ў бакі, а карані апляталі скалу, як буйнакалібернае павуцінне. Раз на год, як і належыць, на ім спелі шышкі, і ён скідаў іх уніз; можа, дзесьці там, пад аблокамі, на зялёных лугах, каля ручаёў яны і маглі вырасці ў самых сапраўдных прыгажунь і атрымаць шанец аказацца фарштэўнем, кілем, а то і носам прыгожага карабля.

А яшчэ Джаспер меў сябра.

Гэта была маленькая дзяўчынка, якая нярэдка гулялася пя яго каранёў, нягледзячы на строгую забарону бацькоў. Яна таксама была з Горада, і Джаспер, калі б захацеў, нават мог цьмяна ўзгадаць яе прадзеда — з тої пары, калі ён яшчэ быў чалавекам.

Спачатку ўсё ішло добра.

Час цягнуўся, нічога не мянялася, ды Джаспер і не хацеў перамен.

Ён для таго і стаў дрэвам, каб шыпулькі свабодна зелянелі на паветры, на галінах цвыркалі птушкі, а карані магутным доўгім высілкам цягнулі вільгаць з зямлі. Але перамены былі непазбежнымі. Да Горада ўнізе правялі шырокую дарогу, і ён застракацеў наметамі, ларкамі і шатрамі з дарагіх адрэзаў тканіны. Праз Горад праходзіла шмат гасцей: ён рос, разбухаў, як кропля. Знаёмая дзяўчынка — здаецца, яе звалі Эмілі, — таксама вырасла і ператварылася ў нязграбнага падлетка... Упершыню Джаспер адчуў нейкі неспакой: яго задавальняла, калі ўсё ідзе, як ёсць. Няхай ён і не хацеў жыць у Горадзе, але любіў яго такім, якім той быў, і гнеўна глядзеў на пухліну, якая расла ўнізе — крывабокія, абы-як пабудаваныя дамкі.

«А што, калі б я зноў нарадзіўся чалавекам, то мог бы ўсё змяніць?» — падумаў ён, але адразу ж адкінуў гэтую недарэчную думку. Да таго ж Эмілі перастала прыходзіць, і Джаспер павольна старэў на сваёй скале...

Але аднойчы сёе-тое змянілася — зусім.

Джаспер упершыню ўбачыў гэтыя клубы дыму раніцай.

Яны падымаліся над стэпам, быццам нябачны жоўты пажар, і загарадзілі сабой палову гарызонту. Крывава-чырвонае сонца падымалася ўгору, купаючыся ў гэтым пыле. А затым пыл стаў набліжацца.

І Джаспер убачыў людзей: маленечкія, як мурашкі, са зморшчанымі тварамі, падобнымі да печаных яблыкаў, і зіхоткімі вострымі шаломамі, яны злосна сцябалі сваіх нізкарослых чэзлых конікаў. Яны імчаліся і імчаліся ад гарызонту да Горада, і не было ім ні канца ні краю.

А затым Горад запалаў!

Агонь разліваўся, як вішнёвае варэнне, якое Джаспер так любіў у чалавечым дзяцінстве. З жахам і лютасцю ён глядзеў, як агонь паглынае выродлівыя пабудовы, што сталі яму цяпер такімі дарагімі.

І тады ён убачыў Эмілі. У сукенцы, якую даводзілася прытрымліваць абедзвюма рукамі, яна імчалася па вузкай сцежцы, абдзіраючы рукі ў кроў і збіваючы чаравікі. Спачатку Джаспер падумаў, што яна бяжыць да яго (што за недарэчная думка?!) — але пасля зразумеў: леваруч праз прорву быў працягнуты вераўчаны мост. Калі па ім перайсці, а затым абсекчы канцы...

У руцэ Эмілі быў зацiснуты нож.

На няшчасце, да моста вяла не адна дарога, а цэлыя тры!

І першыя дзве ўжо запоўніліся людзьмі. Джаспер у гневе глядзеў на гэтыя плоскія твары, захопленыя звярынай пажадлівасцю і злосцю; на адзенне, што больш было падобна на рызз; на мячы — крывыя і залітыя крывёй. Эмі моўчкі абхапіла яго ствол рукамі і заплюшчыла вочы. Дыханне вырывалася з яе грудзей з сіпам, нерытмічнымі рыўкамі.

— Вось і ўсё, раптам прамовіла яна галасам маленькай Эмі. — Бывай, дрэва.

І яна адпусціла пальцы.

Джаспер зароў.

Злаўіўшы вецер, што заблукаў у вышыні, ён паспешліва сплёў з яго патокаў смяротныя вузлы. Старая плоць выдала нямы стогн. Так, ён па-ранейшаму быў моцным і магутным, і мог бы чапляцца за жыццё яшчэ доўга — але не гэтага хацеў. Карані з агідным віскам выдраліся з зямлі. Вырываліся і падалі ў прорву камяні. Дзікуны стоўпіліся каля моста і са страхам пазіралі на гэта дзейства.

— Ён рос над абрывам, — гаўкнуў адзін з іх. — Напэўна, не вытрымаў свайго цяжару. Жыхары неба забіраюць яго. Ён падае.

У глыбокай пашане яны глядзелі, як каласальны ствол перакрэсліў празрысты, блакітнавата-шызы акіян і прызямліўся дакладна на пляцоўку на тым баку.

— О, божа! — выдыхнула Эмілі. — Ты зрабіў гэта для мяне?! Для мяне, дрэва?!

Джаспер сярдзіта зашумеў ветрам у галінах.

Больш не марнуючы часу, яна папаўзла.

Прыгожы крыналін і шоўк не прызначаліся для поўзання па старым ствале хвоі. Яна разадрала локці і распарола спадніцу. Варвары, апаматаўшыся, з галёканнем лезлі за ёй. Але галіны быццам трымалі іх, сукі лезлі ў вочы, ствол вылузваўся з рук. І калі яна, дрыжучы ад напружання, ступіла на цвёрды пятачок па той бок, дрэва раптам зарыпела.

Ніжнія галіны падламаліся, і ствол, зрабіўшы грацыёзны паварот вакол сваёй восі, з пераможным стогнам стрэс, як мурашак, наліплых на яго дзікуноў, і павольна ды велічна адышоў уніз...

Падаў ён доўга, вельмі доўга — бездань была такой, што груку падзення Эмі не пачула.

У вар'яцтве пагоні, у крыві паміраючага горада, у роспачы надзеі ёй здалося, што велічэзны ствол упаў не проста так: ён ратаваў яе ад забойцаў і гвалтаўнікоў, і ён жа павёў іх за сабой.

— Ён ахвяраваў сабой дзеля мяне, — шапнулі разбітыя вусны Эмі. — О, якая вар'яцкая думка!

Але, быць можа, яе суцешыла б тое, што Джаспер, працінаючы воблака і разбіваючыся аб каменную пліту ўнізе, зусім пра гэта не шкадаваў.

Азбука творчасці

# НАПАЧАТКУ БЫЛО СЛОВА...

**Модная сярод журналістаў гульня ў алфавіт была выкарыстана пры размове з галоўным рэдактарам часопіса «Маладосць» Святланай Дзянісавай. Але не было б «Маладосці» без наватарства і эксперыментаў! Замест таго, каб выцягнуць з дзіцячай азбукі выпадковы набор літар, «апанентка» прапанавала націснуць пяць кнопак на клавіятуры. Так, маўляў, бліжэй да паўсядзённай практыкі. Якія, маўляў, літары пад руку трапяць, тыя і будуць «расшыфраваны». Дзіўна, але тое, што трапіла «пад руку», у выніку лёгка склалася ў слова. І гэта было... СЛОВА! Яно і было «расшыфравана» — на кожную літару сказана тое, што асабліва трывожыць або захапляе.**

## С

**— Самалюбаванне.** Часы, калі можна было дазволіць сабе «прыперці рэдактара да сценкі» ў выпадку яго нязгоды надрукаваць твор, апелюючы да фактаў папярэдніх публікацый, «б'ючы» на імя і «рэгаліі», мінаюць. Сама рэальнасць так пастанавіла. Колькі, бывае, прысылаецца твораў ад аўтараў, што маюць цэлыя спісы перамог на шматлікіх літконкурсах, розных там прэмій і званняў, нават выдадзеных кніг, а тэксты пры гэтым, даруйце за рэзкасць, чытаць немагчыма. Ці мусіць «Маладосць» «весціся» на аўтарскую самарэкламу, нават калі ўсё ў ёй сказанае — ад перамог на конкурсах да выдадзеных кніг — чысцюткая праўда? Не. Пакідаючы апісаныя ў самарэкламе поспехі на сумленні тых, хто меў да іх дачыненне, «Маладосць» няхай і надалей з'яўляецца тэрыторыяй, свабоднай ад якой бы там ні было кан'юнктуры, месцам, дзе вартасць тэкстаў вызначаецца выключна прафесійным бачаннем рэдактараў, дзе талент талентам і застаецца. І вось што мне яшчэ хацелася сказаць. Часам за аўтараў прапанаваных нам тэкстаў хадайнічаюць сапраўдныя мэтры. Аднаму пісьменніку школьніца прысвяціла верш, пра твор другога студэнт напісаў рэцэнзію... І паўстае пытанне «на засыпку»: што будзе браць пад увагу рэдактар — імя таго, каму прысвечана, пра твор якога напісана, ці ўсё ж якасць самога матэрыялу? «Маладосць» — такое выданне, якое не толькі за якасць дбае, але і мэтраў, якім «прысвячаецца», у крыўду нізавошта не дасць. Прыкра толькі, што часам тыя крыўдзяцца разам з аўтарамі. Няўжо ўсё роўна, у якім кантэксце бачыць у друку сваё імя?..

## Л

**— Легенда.** Часопіс «Маладосць» — легенда. І калі астранамічны дзень пачынаецца ў мяне з малітвы за сябе і родных, то дзень працоўны — з думкі пра гісторыю тых дзвярэй, якія штораніцы адмыкаю сваім ключом. Не ў літаральным сэнсе, безумоўна, бо дзверы — гэта толькі дзверы. Але для мяне яны — партал. Шчоўк — і я трапляю туды, дзе кожная хвіліна павінна быць скарыстана і пушчана выключна на карысць. Не ганарыцца трэба тым, што ты працуеш на месцы, дзе працавалі Пімен Панчанка і Генадзь Бураўкін, а баяцца. Баяцца схібіць, баяцца сапсаваць. Проста баяцца. Гэта нашмат больш дзейсная практыка. Легенда — гэта калі трапечацца сэрца і па скуры бягуць мурашкі.

## О

**— Опцыі.** Так я называю тое, што ўласціва або не ўласціва тым, хто працуе ў нашай рэдакцыі або прэтэндуе на гэтую працу. Опцыі «спазніцца на працу», «не выканаць заданне ў акрэслены тэрмін», «не стрымаць абяцанне», «схалтурыць», «пайсці па шляху найменшага супраціўлення» ў сапраўднага «маладосцеўца» адсутнічаюць. «Падыходзіць да справы арыгінальна», «мысліць стратэгічна» і «дзейнічаць рацыянальна» — простыя, стандартныя набор. Той, хто хоча працаваць у самым прэстыжным маладзёжным літвыданні краіны, лёгка адказвае на пытанні кшталту: «Колькі свежых ідэй прыйшло ў вашу галаву за апошнія дваццаць чатыры гадзіны?» І ўласнаручна робіць выданне, у якім працуе, самым прэстыжным.

## В

**— Вокладка.** З яе «мастацкім рашэннем» літаратурнаму выданню складаней, чым якому іншаму. Сюжэтныя фотаздымкі з героямі часу «Маладосць» на сваіх вокладках ужо размяшчала. Працы маладых мастакоў і дызайнераў (самая частая прапанова пры пошуку свежых ідэй) — таксама. Трафарэтныя «пытальнікі», яны ж паўшар'і галаўнога мозга, яны ж яркі фон для шэрай безабліччнай постаці прайшлі праз частку «нулявых» і змяніліся выявай «Залатой літары» — як сімвала поспеху. Шчаслівыя твары юных паэтаў — было. Кветкі ў якасці папярэджвання, што першы поспех — гэта толькі «кветачкі», і каб не аказаўся дэбют «пустацветам», каб літаратурная творчасць прынесла плады, патрэбна ўпартая, нястомная, цяжкая праца, — таксама ў змястоўным мінулым. Што наперадзе? Сёлета «Маладосць» «запусціла» праект «Прозвішчы», даўшы маладым мастакам магчымасць «убачыць» сваіх Агінскага, Ажэшку, Драздовіча, Быкава, Цётку, Баршчэўскага з Нікіфароўскім... Чаму без імёнаў? Ды лічыцца, што адукаваны чалавек (якім, безумоўна, чытач «Маладосці» з'яўляецца) дакладна ведае, як завуць таго ці іншага генія нашай культуры, а фамільярнасць тут ні пры чым. Найбліжэйшым часам рэдакцыя правядзе чарговы brainstorming — і стане вядома, якой будзе вокладка «Маладосці» ў 2016-м. А пакуль што можна ўпэўнена паведаміць, што часопіс чакае ўвогуле новы дызайн.

## А

**— Амбіцыі.** Часопіс «Маладосць» для тых, хто мае амбіцыі. Хто іх мае, той не прышле ў рэдакцыю тэкст, які не «адляжаўся», не перачытаўся «як чужы». Амбіцыйны паэт не прынясе падборку з вершамі, якія ўжо недзе друкаваліся або былі вернуты. Навошта? Амбіцыйны празаік не будзе ўласнаручна даваць свайму твору ацэнку — быццам набіваючы кошт. Дзеля чаго? Амбіцыйны публіцыст піша толькі тое, што трэба. Як праверыць, што напісана толькі тое, што трэба? Такі тэкст немагчыма скараціць, пад такі тэкст уражаны рэдактар са слязьмі шчасця на вачах гатовы аддаць любую колькасць старонак. За «вадзяністы» тэкст я «дзякуй» не скажу, а вось за высечаныя нізавошта дрэвы магу зрабіць аўтару вымову, і няхай не крыўдуе. Бо часам бываюць цэлыя кавалкі ні пра што, або паўторы, або нічым не абгрунтаваныя адступленні. Амбіцыйны журналіст не звяртаецца да героя інтэрв'ю па імені, не вітаецца, не развітваецца, не гаворыць «дзякуй» і не жадае поспехаў — гэта лішняе ў тэксце, гэта «за кадрам», пра гэта чытач і без таго ведае. Журналістыка паспяховых часопісаў — гэта рацыянальная, ашчадная журналістыка, яна не адбірае ў чытача лішні час, а ў выдання — лішнюю паперу. Амбіцыйны літкрытык? Ён будзе пісаць, а не адмаўляцца ад гэтай працы па той прычыне, што за яе «мала плацяць». Урэшце, «Маладосць» стваралася для тых, хто не можа не пісаць...

Запісала
**Любоў ВАБІШЧЭВІЧ.**
**Фота Наталлі АСМОЛЫ.**



Векапомнае

# УНУКІ ПІШУЦЬ ПРА ВАЙНУ...

**Бадай, не знайсці ў Беларусі такой сям'і, якую абмінула Вялікая Айчынная вайна. На жаль, а можа, на шчасце, мне не было каму пра яе расказваць. Маіх прадзедаў не ўзялі на фронт з-за сталага ўзросту, дзяды ж — як ні парадаксальна — былі яшчэ малымі. Пра вайну я даведалася са школьных падручнікаў і літаратурных твораў.**

**Іншым пашчасціла мець у сям'і сваіх герояў. Іх гісторыі передавалі-ся наўпрост (часам зайздрошчу свайму мужу, у якога і сёння дзед-франтавік шчодры на ваенныя аповеды). А нашчадкі пакалення пераможцаў, у сваю чаргу, перадаюць іх нам — у тым ліку са старонак кнігі «Ніколі не забудзем. Унукі пра вайну», якая напярэдадні 70-годдзя Вялікай Перамогі выйшла ў Выдавецкім доме «Звязда».**

**У межах аднайменнага конкурсу, які праводзіла піянерская арганізацыя Беларусі, з усіх куточкаў краіны пасыпаліся апавяданні, эсэ, вершы пра тых, хто не па чутках ведаў і ведае, што такое вайна. Такога рэзанансу нават не чакалі! Якім чынам праводзіўся адбор твораў, пра каго пісалі дзеці і ўвогуле, ці могуць быць упэўнены ветэраны, што памяць пра вайну будзе жыць, расказала аўтарка ідэі праекта, старшыня Беларускай рэспубліканскай піянерскай арганізацыі Вікторыя МЯНАНАВА.**



Старшыня Беларускай рэспубліканскай піянерскай арганізацыі Вікторыя МЕНАНАВА падчас прэзентацыі кнігі «Ніколі не забудзем. Унукі пра вайну».

***— Можа, і ў вашым радаводзе, Вікторыя, былі ці ёсць тыя, хто варты аповеду?***

— У Вялікай Айчыннай вайне ўдзельнічаў мой прадзед па матчынай лініі — Караў Міхаіл Фёдаравіч. На першапачатковым этапе вайны ён быў баявым камандзірам, але пасля яго накіравалі ў тыл ва Узбекістан. Там і сустрэў Вялікую Перамогу.

***— Проста здзіўляешся, з якой дасведчанасцю дзеці пішуць пра тых, каго нават ніколі не бачылі...***

